

УНІКАЛЬНАЯ ВАКЦЫНА АД РАКУ

6

СУДЫ ЗА ХАТУ БЕЗ ДАХУ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЛЮТАГА 2023 г.
СЕРАДА
№ 25 (29905)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЛІЧБА ДНЯ

**8142,8 млн долараў**

*у эквіваленце склалі, паводле папярэдніх звестак, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 лютага 2023 года. Пра гэта паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. За студзень 2023 года золатавалютныя рэзервы выраслі на $213,3 мільёна (2,7 працэнта) пасля павелічэння ў снежні 2022 года на $131,8 млн (1,6 працэнта). Паведамляецца таксама, што фізічныя асобы ў Беларусі ў студзені прадалі на $89,2 млн наяўнай замежнай валюты больш, чым купілі. Агульны аб'ём прададзенай фізічнымі асобамі наяўнай замежнай валюты ў студзені бягучага года склаў $548,2 мільёна, набытай — $459 мільёнаў.*



# У паход па здароўе



У райцэнтры Ушачы шырыцца сапраўдная мода на здаровы лад жыцця — усё больш жыхароў далучаюцца да заняткаў скандынаўскай хадзьбой. Пачаў гэтую традыцыю яшчэ сем гадоў таму мясцовы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У ім па ініцыятыве загадчыка аддзялення цэнтра Таццяны ШЫШКО арганізаваўся гурток аматараў здаровага ладу жыцця, якія, нягледзячы на паважаны ўзрост, хочуць быць у добрай форме. Гурток назвалі красамоўна — «Сцяжына здароўя». Цяпер кожны дзень не толькі сябры «Сцяжыны», але і іншыя жыхары накіроўваюцца на лясныя загарадныя дарожкі (лес побач з гарпасёлкам), адмерваюць сваё пяць—сем кіламетраў, дыхаюць свежым хваёвым паветрам. Мне пашанцавала ўбачыць і зрабіць фота групы бадзёрых ушачанак, якія выпраўляліся па сваім здаровым маршруце.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Беларусі запасаў торфу хопіць на 70 гадоў.**
- Старшакласнікаў запрашаюць паўдзельнічаць у інтэрнэт-алімпіядзе па выбарчым праве.
- **Матэрыяльны ўрон для Беларусі ад дзеянняў фашыстаў у гады ВАВ склаў не менш як $2,3 трлн.**
- Авіякампанія Nordwind Airlines адкрые прамыя рэйсы з Пярмі ў Мінск з 2 красавіка.
- **У Кіраўскім раёне аграрыі высадзілі першыя ў гэтым сезоне таматы і агуркі.**

ISSN 1990 — 763X
23025>
9 771990 763008

Вяртанне да тэмы

# ПАЛЯНАЎСКІЯ «АЎСТРАЎЛЯНЕ»

### Як жывуць і каго чакаюць у госці жыхары адрэзанага вадой населенага пункта

**«Звязда» працягвае сачыць за развіццём паводкавай сітуацыі на тэрыторыі Веткаўскага раёна Гомельшчыны. Нагадаем, што ў канцы студзеня жыхары пасёлка Паланаўка і найбліжэйшага садовага таварыства з-за падтопленай дарогі аказаліся ізаляванымі. Заложнікамі «вялікай вады» сталі звыш двух дзясяткаў вяскоўцаў.**




**Для людзей, якія мусяць дабірацца ў Гомель на працу, у найбліжэйшы аграгарадок Старое Сяло ва ўрачэбную амбулаторыю, у аптэку, школу, краму, была арганізавана лодачная пераправа. Некалькі дзён таму адталую не ў пару пойму зноў скаваў лёд — пераправа на лодках стала немагчымая. Карэспандэнт «Звязды» разам з супрацоўнікамі Веткаўскай выратавальнай станцыі і камандай рэагавання ў надзвычайных сітуацыях Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа па лядовым маршруце адправілася наведаць паланаўскіх «аўстраўлян».**

СТАР. 4

Лічбавая Беларусь

# Мабільны дадатак раскажа пра будучую пенсію



**З 1 лютага запушчаны мабільны дадатак Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Спампаваўшы яго, можна даведацца інфармацыю аб будучай пенсіі: ваш страхавы стаж, найменні работадаўцаў і час, які вы ў іх адпрацавалі, узносы, якія выплачвае работадавец (і пракантраляваць, ці робіць ён тое). Якія яшчэ магчымасці з'явяцца ў будучым, дзякуючы мабільнаму дадатку і ці можна вылічыць такім чынам будучую пенсію, расказала кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА.**

Дадатак, які носіць назву ФСАН, прадставіць даныя, што маюцца на вашым асабовым рахунку ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва. Як вядома, там з 2003 года вядзецца індывідуальны персаніфікаваны ўлік, які збірае электронныя звесткі аб кожным працуючым.

СТАР. 3

З першых вуснаў

# «Нашай банкаўскай сістэме дастаткова свабоды, каб не плесціся ў хвасце падзей»

**Удасканаленне заканадаўства па пытаннях банкаўскай дзейнасці абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. І, як звычайна, першае пытанне ад кіраўніка дзяржавы да спецыялістаў: навошта, каму трэба і ці трэба гэта зараз? Ён падкрэсліў, што не трэба ісці шляхам рэкамендацый, якія дадзены ў мінулым стагоддзі. Напрыклад, аб тым, што банкі павінны быць дзяржавай у дзяржаве, павінны быць абсалютна незалежнымі... «Няма ў свеце нічога незалежнага, усе адзін ад аднаго залежаць: і арганізацыі, і ўстановы.... Нашай банкаўскай сістэме дастаткова свабоды, каб не плесціся ў хвасце падзей і каб разам з урадам працаваць на эканоміку», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння банкі, Нацыянальны банк — гэта не бухгалтэрыя ўрада, як калісьці лічылі. «Урад у нас адказвае за эканоміку. Банкаўская сістэма і банкі — крывяносная сістэма эканомікі. Ну паспрабуйце аддзяліць гэтую крывяносную сістэму ад эканомікі», — адзначыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу на неабходнасць сачыць за тым, каб не было разбалансаванасці.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што разгляд змяненняў заканадаўства датычна банкаўскай сістэмы не азначае, што банкаўская сістэма працуе дрэнна і яе нарматыўная база патрабуе кардынальнага перагляду. «Ва ўмовах санкцый банкі прадэманстравалі ўстойлівасць, забяспечылі захаванасць зберажэнняў, правядзенне разлікаў і акумуляванне рэсурсаў для крэдытавання. Летась дзякуючы каардынацыі дзеянняў Нацыянальнага банка і ўрада ўдалося паскорыць пераарыентацыю экспарту, падтрымаць прадпрыемствы аваротнымі сродкамі, прафінансаваць найважнейшыя для краіны інвестпраекты», — сказаў ён.

Але існуюць і праблемныя пытанні. Прэзідэнт канстатаваў, што катэгарычна не задаволены работай урада і банкаў па рашэнні пытання з праходжаннем плацяжоў падчас знешнегандлёвых аперацый. «Проста трэба ўпірацца і працаваць», — заявіў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што спецыялістам Нацыянальнага банка і іншым банкам трэба падключыцца да вырашэння праблемы праходжання плацяжоў. «Гэтай праблемы быць не павінна. Яе няма: мы проста абы-як працуем. І асобныя нашы прыватнікі паказваюць, як трэба працаваць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «Пэўныя змены наспелі»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў нашай краіне забяспечана абарона інтарэсаў укладчыкаў. Беларусь — ледзь не адзіная краіна ў свеце, якая гарантуе насельніцтву поўнае вяртанне ўкладаў незалежна ад сумы і валюты ў выпадку эканамічнай неплацежаздольнасці банка. «Але жыццё не стаіць на месцы. Развіваюцца тэхналогіі, узнікаюць новыя выклікі ў сферы адмывання даходаў, больш вынаходлівым становіцца кібермахлярства, будуецца новая сістэма ўзаемаразлікаў, у тым ліку ў міжнародным гандлі. Словам, пэўныя змены наспелі. Я баюся забягаць наперад, але мне здаецца, што хуткім часам у свеце з'явяцца новыя магутныя валютныя саюзы з новай рэзервовай валютай», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларускі і расійскі бакі своечасова дамовіліся аб збліжэнні банкаўскага заканадаўства ў інтарэсах суб'ектаў гаспадарання. Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што беларусы павінны працаваць з расійскімі калегамі па банкаўскай сферы выключна ў інтарэсах суб'ектаў гаспадарання.

Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне органам дзяржаўнага кіравання і кантролю прааналізаваць работу банкаўскай сістэмы і ўнесці свае прапановы па карэкціроўцы банкаўскага заканадаўства. Ён падкрэсліў пры гэтым, што людзі павінны ведаць, якія змены плануюцца. Ці не засталося нейкіх непрапрацаваных, шэрых, не дай бог, «цёмных» месцаў.

«Беларусь — сацыяльная дзяржава. Правілы эканамічнай дзейнасці павінны зыходзіць з прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці, адначасова аднязначна тлумачыцца і безумоўна выконвацца. Выключэнняў для нейкіх сфер, у тым ліку банкаўскай, няма і не будзе. У рэгулятара павінны быць усе неабходныя рычагі ўплыву ў фінансавай галіне, у тым ліку для пакарання нядбайных банкаў рублём і іншым, — сказаў Прэзідэнт. — У наш час асабліва важна, каб усе галіны ўлады, органы дзяржаўнага кіравання працавалі ў цеснай звязцы. Толькі разам можна забяспечыць мабілізацыю рэсурсаў на найважнейшых кірунках устойлівага развіцця эканомікі».

Кіраўнік дзяржавы папрасіў не расслабляцца. Ён падкрэсліў, што Расію спрабуюць уразіць дадатковымі санкцыямі. А каб не было шляхоў адыходу, Беларусь дадатковымі санкцыямі будуць не проста палохаць, а таксама «забяспечваць». Па яго словах, ключавую ролю ў вырашэнні звязаных з гэтым пытанняў павінны іграць банкі і Нацыянальны банк як рэгулятар усёй банкаўскай сістэмы.

Аляксандр Лукашэнка падсумаваў, што па выніках нарады павінны быць дадзены канчатковыя і аргументаваныя адказы на пытанні: як нованўвядзенні паўплываюць на работу банкаўскай сістэмы і ці патрэбныя яны ўвогуле, ці адпавядаюць гэтыя навацыі запытам грамадзян і нацыянальнай эканоміцы? Таксама кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба адказаць на пытанне, ці ўсе пытанні інтэграцыйнага парадку дня Саюзнай дзяржавы ў частцы банкаўскай сферы будуць закрыты абноўленым кодэксам? «Усе інтэграцыйныя праекты ў банкаўскай сферы з Расіяй павінны быць нам выгадныя. Гэта наш крытэрый», — падсумаваў беларускі лідар.

## Актуалізацыя банкаўскага заканадаўства ідзе «ад жыцця»

З дакладам аб асноўных кірунках удасканалення банкаўскага заканадаўства выступіў старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур. «Прапанаваныя змяненні можна ўмоўна падзяліць на два блокі. Першы — гэта ініцыятывы макраэканамічнага характару. Другі — накіраваныя на рэгуляванне дзейнасці банкаў», — расказаў ён.

Сярод прапанаваных змяненняў асобна можна вылучыць блок заканадаўчых ініцыятыў макраэканамічнага характару. Прапануецца ў дадатак да мэты «падтрыманне цэнавай стабільнасці» замацаваць другую мэту — «забеспячэнне фінансавай стабільнасці», а таксама норму аб садзейнічанні ўстойліваму эканамічнаму развіццю краіны. «З прававога пункту гледжання гэта дасць магчымасць упарадкаваць адказнасць і паўнамоцтвы на забеспячэнне фінансавай стабільнасці, а таксама ўдакладніць ключавыя кірункі дзейнасці Нацыянальнага банка. Эканамічны эфект — узрасце накіраванасць грашова-крэдытнай палітыкі на фарміраванне спрыяльнага асяроддзя для ўстойлівага развіцця эканомікі», — растлумачыў кіраўнік Нацбанка. Другая ініцыятыва звязана з удасканаленнем прававога механізму забеспячэння фінансавай стабільнасці.

Змяненні, якія плануюць унесці ў банкаўскае заканадаўства, накіраваныя на рэгуляванне дзейнасці банкаў. Вялікая частка з іх звязана з абаронай правоў спажыўцоў банкаўскіх паслуг і выключэння празмернай фінансавай нагрузкі на крэдытаатрымальніка. Для гэтага, па-першае, уводзіцца забарона на ўстанаўленне ў крэдытных дагаворах умоў аб выплаце працэнтаў у павышаным памеры, абмяжоўваюцца памеры штрафаў; па-другое, устанаўліваецца пералік выпадкаў, пры якіх банк мае права патрабаваць датэрміновага вяртання крэдыту; па-трэцяе, вызначаецца разумны тэрмін для датэрміновага вяртання крэдыту (не раней як тры месяцы з дня паведамлення фізічнай асобе).

«Гэтая норма мае сацыяльную накіраванасць, а яе рэалізацыя дасць магчымасць узмацніць прававую абароненасць спажыўцоў фінансавых паслуг», — заявіў Павел Калаур.

Таксама ўнесена прапанова аб устанаўленні кваліфікацыйных патрабаванняў да дзелавой рэпутацыі службовых асоб, якія выконваюць ключавыя функцыі ў банку, замацаваць абавязак «праходжання імі ацэнкі адпаведнасці такім патрабаванням».

Кіраўнік дзяржавы па выніках нарады ў цэлым ухваліў прапанаваныя навацыі. Разам з тым ён даручыў дапрацаваць асобныя палажэнні, «дашліфаваць» дакумент і ў найбліжэйшы час унесці яго на разгляд у парламент. Па словах Паўла Калаура, Банкаўскі кодэкс — гэта верхнеўзроўневы профільны дакумент. Неабходная дэталізацыя і канкрэтызацыя асобных нормаў будзе аператыўна забяспечана ў адпаведных тэматычных законапраектах і падзаконных актах.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

## У законапраекце ўлічаны інтарэсы крэдытаатрымальнікаў

Пасля нарады ў Прэзідэнта **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла НІЖЭВІЧ** расказала журналістам, што навацыі ў заканадаўстве аб банкаўскай дзейнасці прадугледжваюць у тым ліку зніжэнне фінансавай нагрузкі на крэдытаатрымальнікаў. Яна падкрэсліла, што гэтыя навацыі адпавядаюць патрабаванням часу. Многія прапановы накіраваны на ўзмацненне абароны грамадзян. Напрыклад, прадугледжваецца зніжэнне фінансавай нагрузкі на крэдытаатрымальнікаў, змяншэнне для іх штрафных санкцый. Вызначаецца пералік выпадкаў, калі ўзгодненыя рашэнні, якія датычацца крэдытавання, выносяцца банкамі сумесна з фізічнымі асобамі. «У цэлым законапраект накіраваны на ўмацаванне фінансавай сістэмы і супрацьстаянне тым выклікам, якія сёння стаяць перад краінай», — падсумавала Людміла Ніжэвіч.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** падкрэсліла, што прапанаваныя навацыі вельмі важныя для эканомікі і грамадзян. Напрыклад, прапанова аб змяншэнні штрафных санкцый. «Бываюць выпадкі, калі банкі пры затрымцы выплаты крэдыту на 1-2 дні выстаўляюць штрафныя санкцыі вялікіх памераў. У абноўленым Банкаўскім кодэксе ўжо рэгулююцца і дакладна вызначаюцца выпадкі, калі банк можа прад'яўляць штрафныя санкцыі. Для насельніцтва вось гэта вельмі важная навацыя. Тонкасці мы будзем яшчэ абмяркоўваць», — растлумачыла яна.

Таццяна Рунец расказала, што ў Савет Рэспублікі паступаюць звароты ад грамадзян з прапановай зрабіць безумоўнай магчымасць датэрміновага пагашэння спажывецкіх крэдытаў — без згоды на тое банка. Гэтае пытанне таксама ўважліва разглядаецца пры рабоце над новым Банкаўскім кодэксам.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Расце колькасць ахвяр землетрасення ў Турцыі

**Колькасць загінулых пры землетрасенні ў Турцыі, якое адбылося раніцай 6 лютага, вырасла да 3549. Пра гэта паведаміў віцэ-прэзідэнт краіны Фуат Актай, перадае CNN Turk.**

Па словах Актая, на ўчарашні дзень колькасць пацярпелых дасягнула 20 534 чалавек, 5775 будынкаў пашкоджана або разбурана цалкам. Цяпер на месцах працуюць выратавальныя групы з 12 181 чалавека, паведаміў Фуат Актай. Вядома таксама, што дапамогу Турцыі для ліквідацыі наступстваў ад землетрасення накіравалі 14 краін. Тым часам ЮНЕСКА плануе прыцягнуць сваіх экспертаў у мэтах ацэнкі пашкоджанняў, якія былі нанесены гістарычнай крэпасці Газіянтэп у Турцыі і цытадэлі Алепа ў Сірыі пасля землетрасення, заявіў прэс-аташэ арганізацыі Тама Малара. «ЮНЕСКА выказвае шкадаванне наконт абвальвання будынкаў аб'екта Сусветнай спадчыны «Культурны ландшафт крэпасці Дыярбакыр і садоў Хеўсель» у Турцыі», — сказаў ён. Гэтыя аб'екты ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Таксама паведамляецца, што сірыйскі Чырвоны Крыж заклікаў краіны Захаду зняць аднабаковыя санкцыі з Дамаска ў рамках дапамогі пасля магутнага землетрасення. Пра гэта заявіў кіраўнік арганізацыі Халед Хбубаці.

Нагадаем, што раніцай 7 лютага новыя падземныя штуршкі магнітудай 5,7 былі зафіксаваны ва ўсходняй частцы Турцыі — за 34 кіламетры на паўднёвы ўсход ад горада Малацья.

## КНР можа даць стратэгічны адказ, калі ЗША размесцяць ракеты ў Японіі

**У выпадку калі Злучаныя Штаты размесцяць ракеты ў Японіі, ад Кітая можна чакаць стратэгічнага адказу, піша газета Global Times.**

Размяшчэнне амерыканскіх ракет у Японіі будзе пагражаць не толькі КНР, але і Паўночнай Карэі, і Расіі, піша аўтар артыкула. «Пекін мае права распачаць стратэгічныя дзеянні ў адказ на такі правакацыйны і небяспечны акт з боку ЗША», — гаворыцца ў публікацыі. Па словах кітайскіх ваенных аналітыкаў, размяшчэнне ракет у Японіі з боку ЗША будзе азначаць, што Вашынгтон фактычна плануе ваенную інтэрвенцыю. Аўтар публікацыі таксама нагадаў японскім уладам, што ЗША выкарыстоўваюць Японію ў якасці аперацыйнай базы.

## У Малдове ўсумніліся ў карысці далучэння да НАТА

**Уступленне ў НАТА не вырашыць праблемы бяспекі Малдовы, заявіў віцэ-спікер парламента краіны, выканаўчы сакратар Партыі сацыялістаў Улад Батрынча.**



На яго думку, далучэнне краіны да якога-небудзь ваеннага блока не вырашыць праблему, нягледзячы на прапаганду такога кроку з боку малдаўскіх улад. Пры гэтым ён адзначыў, што вырашэнне адпаведнага пытання «ляжыць у дыпламатычнай плоскасці». «Мы ўсё яшчэ не навучыліся будаваць масты і атрымліваць выгаду з гісторыка-геаграфічнага становішча нашай краіны. Малдаўскі народ не хоча і не можа мець ніякага дачынення да ваенных кампаній Паўночнаатлантычнага альянсу», — дадаў ён. Раней прэм'ер-міністр краіны Наталля Гаўрыліца паведамляла аб жаданні ўлад краіны пачаць перагаворы аб уступленні ў Еўрапейскі саюз у 2023 годзе.

Рэгiёны

# Медыцына, палацы і нават слон

**Аб чым яшчэ ішла размова падчас прэс-канферэнцыі старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Караніка**

**Паводле слоў губернатара, даход абласнога бюджэту летась вырас на 19 працэнтаў. Гэта дазволіла выканаць усе сацыяльныя абавязацельствы і павялічыць фінансаванне інвестпраграм. Год можна лічыць паспяховым і па прыцягненні замежных сродкаў. Іх аб'ём склаў 225 мільёнаў долараў, з якіх пераважная большасць — гэта прамыя замежныя інвестыцыі. Многія інвестары ўкладваюць свае грошы ў далейшае развіццё праектаў і пашыраюць бізнес.**



У кожным раёне плануецца рэалізаваць па адным значным інвестпраекце — у галіне дрэваапрацоўкі, лёгкай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, нафтахіміі.

Нягледзячы на эканамічныя санкцыі, станоўчае сальда гандлю вырасла. Гэта значыць, што санкцыі вывелі прадпрыемствы на іншыя рынкі збыту. Зараз стаіць задача захаваць гэту тэндэнцыю і працягваць асвойваць новыя кірункі.

## УПОР НА ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ

Сёлета запланавана пабудаваць 465 тысяч кв. м жылля, з іх 155 тысяч — з дзяржпадтрымкай.

Павялічыцца будаўніцтва арэнднага жылля, якое будзе выдзяляцца ў першую чаргу работнікам бюджэтных сфер — урачам, педагогам — для замацавання маладых спецыялістаў. Таксама ў прыярытэце прадстаўнікі сілавога блока і шматдзетныя сем'і. Плануецца, што сёлета 1600 такіх сем'яў палепшаць свае жыллёвыя ўмовы.

Губернатар падкрэсліў, што акцэнт будзе зроблены на развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Пад малапавярховую забудову тыпа таўнхаўс плануецца адвесці 175 тысяч «квадратаў». Паралельна ў новых мікрараёнах будзе ўзводзіцца сацыяльная інфраструктура — школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі, дарогі.

## МЕДЫЦЫНА — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

На фінансаванне галіны выдаткоўваецца 26 працэнтаў бюджэту.

Адзін з самых важных аб'ектаў — анкадыспансер, будаўніцтва якога вядзецца ў абласным цэнтры. Сёлета плануецца ўвод першай чаргі — радыелагічнага аддзялення. Закуплена высокатэхналагічнае абсталяванне. Хутка служба пачне прымаць пацыентаў, якія пакуль праходзяць курсы прамянёвай тэрапіі ў іншых рэгіёнах.

Рыхтуецца праект будаўніцтва новай бальніцы ў Гродне. Гэта будзе сучасная ўстанова, якая забяспечыць даступнасць самых запатрабаваных відаў медыцынскай дапамогі.

Вырашаецца пытанне па выдатканні сродкаў на мадэрнізацыю фтызіятрычнага дыспансера. Плануецца пачаць работы ўжо сёлета, каб частку палат перавесці на новыя плошчы. Гэта дазволіць не зніжаць даступнасць медыцынскай дапамогі і забяспечыць дастойны ўзровень знаходжання пацыентаў.

У цэлым мадэрнізацыя ахопіць многія ўстановы аховы здароўя рэгіёна. У горадзе атамшчыкаў — Астраўцы — замест старой бальніцы з'явіцца сучасная паліклініка. Капітальны рамонт чакае бальніцу ў Карэлічах і паліклініку ў Навагрудку. А вось жыхары мікрараёна Паўднёвы ў Гродне змогуць наведваць новую паліклініку, будаўніцтва якой завяршаецца.

## БЯЗВІЗ І МЯСЦОВЫ ЗБОР

Бязвізавы ўезд для грамадзян суседніх краін, які быў уведзены летась, даволі станоўча паўплываў на эканоміку рэгіёна. Даходы ад турыстычных паслуг выраслі на 85 працэнтаў, што склала 12 мільёнаў долараў. Права на бязвіз атрымалі не толькі турыстычныя групы, але і асобныя грамадзяне. Такім чынам, летась рэгіён наведалі больш за 3 200 чалавек, што ў 10 разоў больш, чым у папярэднім 2021 годзе. І гэта лічба расце.

Паводле слоў губернатара, значна папоўніў бюджэт вобласці мясцовы збор за перасячэнне мяжы. За паўтара года ён склаў 21 мільён рублёў. Гэтыя сродкі былі накіраваны на ліквідацыю наступстваў, звязаных з пандэміяй каранавіруса, а таксама на фінансаванне ўстаноў аховы здароўя. Між тым мясцовы збор, які быў адноўлены з 1 лютага ў памеры адной базавай велічыні, ніяк не паўплываў на паток турыстаў.

## КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

У вобласці актывізавалася работа па аднаўленні архітэктурных помнікаў. Цалкам прайшлі рэканструкцыю Мірскі і Лідскі замкі. Працягваюцца работы ў замках Крэва і Навагрудка. Вядзецца маштабная рэканструкцыя Старога замка ў Гродне. Нядаўна тут былі адкрыты для наведвальнікаў тры інтэр'ерныя залы, на чарзе яшчэ адна — самая раскошная.

Шэраг аб'ектаў праходзяць рэканструкцыю ў рамках прыватна-дзяржаўнага партнёрства. Інвестар уцягвае іх у гаспадарчую дзейнасць — адкрываюцца кафэ, музеі, гасцініцы. Як адзначыў Уладзімір Каранік, прыкладам такога партнёрства з'яўляецца палацава-паркавы комплекс у Свяцку, дзе вядзе работы санаторый «Азёрны». Мяркуецца, што сёлета аб'ект прыме першых турыстаў. Дарэчы, падыходы да рэканструкцыі аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці трэцяй катэгорыі спрасціліся, што дазволіць больш актыўна ўцягваць іх у гаспадарчы абарот.

## ЦІ БУДЗЕ СЛОН?

Губернатар запэўніў, што будзе.

Вось ужо 20 год, як у Гродзенскім заапарку чакаюць слана. Менавіта столькі часу прайшло з тае пары, як не стала тут слана Сурака, якога прывезлі з нямецкага Лейпцыга ў 60-ыя гады. Па словах Уладзіміра Караніка, пытанне па слане абмяркоўвалася падчас наведвання ім заапарка ў канцы года. Праўда, ёсць пытанне па сланоўніку, бо памяшканне патрабуе дапрацоўкі. Мяркуецца, што гэта будзе зроблена ўжо сёлета. Што датычыцца слана, перагаворы аб яго набыцці неаднаразова вяліся, і была дасягнутая пэўная дамоўленасць, але давесці справу да канца не атрымалася. Між тым зараз ёсць некалькі варыянтаў, якія даюць падставу спадзявацца, што слон з'явіцца ў заапарку ўжо сёлета. Абласныя ўлады гатовы аказаць у гэтым пытанні неабходную падтрымку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота прэс-служба аблвыканкама.**

# Мабільны дадатак раскажа пра будучую пенсію

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёння ў сістэме персаніфікаванага ўліку адкрыта 8 мільёнаў 300 тысяч асабовых рахункаў. Штогод палова з іх папаўняецца інфармацыяй, якая характарызуе працоўную дзейнасць грамадзян, што працуюць па працоўных, грамадзянска-прававых дагаворах ці ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць. Інфармацыя характарызуе і перыяды работы, і ўзносы ў бюджэт фонду, якія паступаюць як на пенсійнае, так і на сацыяльнае страхаванне. Мабільны дадатак дасць просты і зручны спосаб атрымаць інфармацыю ў зручны час у любым месцы ў электронным выглядзе праз смартфон, — тлумачыць Юлія Берднікава.

Спампаваць мабільны дадатак можна на пляцоўцы Google Play. У будучым плануецца пашырыць лічбавыя пляцоўкі. Уваход прадугледжаны праз міжбанкаўскую сістэму ідэнтыфікацыі. Для гэтага варта ў ёй зарэгістравацца. Уваход будзе ажыццяўляцца па вашых лагіне і паролі, якія вы выберыце, ці па ID-картцы.

Мабільны дадатак прадугледжвае шэраг функцыянальных магчымасцяў, перш за ўсё гэта даныя вашага пасведчання дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, больш вядомага як «зялёная картка». Пасведчанне можна спампаваць на свой тэлефон ці выслаць на адрас электроннай пошты.

Можна атрымаць і звесткі пра сваю працоўную дзейнасць. Яны ўлічваюцца ў электроннай базе фонду з 2003 года. Найперш гэта перыяды працоўнай дзейнасці з датамі прыёму і звальнення. З 1 студзеня 2019 года тыя звесткі істотна пашырыліся, і цяпер там маюцца ўсе даныя, якія заносяцца ў працоўную кніжку. Такая назва прафесіі і пасады, рэквізіты лакальнага акта аб прыёме на работу, найменне структурнага падраздзялення, від працоўных адносін, кваліфікацыйная катэгорыя, прысвоены клас ці разрад. Гэта інфармацыя знаходзіцца ў рубрыцы «Працоўная дзейнасць».

У раздзеле «Перыяды работы па грамадзянска-прававым дагаворы» зафіксавана, у якіх наймальнікаў вы працавалі, даты пачатку і заканчэння дзейнасці ў рамках грамадзянска-прававых адносін. Гэтыя звесткі таксама маюць значэнне пры прызначэнні будучай пенсіі.

Значнай з'яўляецца і інфармацыя аб выплаце работадаўцам узносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне.

— Тут варта прызнаць, што не ўсе работадаўцы законапаслухмяныя. У гэтай галіне органы фонду вядуць нагляд і кантроль. Цяпер і грамадзянін са свайго боку можа таксама кантраляваць тую інфармацыю, якую яго работадавец прадставіў у фонд сацыяльнай абароны і як яна ўлічана на індывідуальным асабовым рахунку, — падкрэсліла Юлія Берднікава. — Гэта індывідуальныя звесткі аб налічаных выплатах і ўзносах, а таксама выплачаныя ўзносы. Як вядома, яны паступаюць на пенсійнае і сацыяльнае страхаванне. Узносы на пенсійнае страхаванне дазваляюць атрымаць права на будучую пенсію, а сацыяльныя — на цэлы комплекс сацыяльных дапамог. Гэта як дапамогі па часовай непрацаздольнасці (так званыя бальнічныя), так і шэраг сямейных дапамог, у тым ліку па нараджэнні і доглядзе дзіцяці. Інфармацыя акумулюецца ў разрэзе кожнага года.

Варта адзначыць, што выплачаныя ўзносы адлюстраваны толькі з 2013 года, бо з гэтага часу звесткі сталі ўлічвацца асобна па кожным працуючым.

Самая запатрабаваная інфармацыя — страхавы стаж, які, уласна, і дае права на будучую пенсію. Як вядома, на сёння парог страхавога стажу складае не менш за 19 гадоў, налета ён павялічыцца да 19,5 года, у 2025 годзе дасягне 20 гадоў. Дадатак разлічвае страхавы стаж аўтаматычна. Гэта колькасць гадоў, месяцаў і дзён, якія за апошнія 20 гадоў назапашаны і ўлічаны для будучай пенсіі.

— Ён лічыцца па тых звестках, якія ўлічаны з 2003 года, і праактыўна разлічваецца фондам. Вы ўбачыце дату, на якую ён разлічаны, — у гэты час апошні раз абнавіліся звесткі. У фонд яны паступаюць кожны квартал, — тлумачыць кіраўнік фонду. — Таксама ўказана, колькі месяцаў і дзён у канкрэтным каляндарным годзе грамадзянін займеў для будучай пенсіі. Тут жа маецца радок «Каэфіцыет заліку». Звычайна ён роўны 1 і азначае, што ў гэты час выплаты ў фонд налічваліся з заробку не меншага, чым мінімальны. Адзін месяц працоўнага стажу залічваецца пры ўмове, што ў гэтым месяцы былі налічаны і выплачаны ўзносы з заработнай платы, не меншай за мінімальную.

У перспектыве ў мабільным дадатку з'явяцца і новыя функцыянальныя магчымасці. У прыватнасці, рубрыка «Паведамленне». Там вас аператыўна праінфармуюць, што на ваш асабовы рахунак паступаюць узносы, налічаныя з заробку, ніжэйшага за мінімальную заработную плату. Таксама ёсць шэраг іншай інфармацыі, якая прысутнічае на асабовым рахунку, доступ да яе з'явіцца праз мабільны дадатак. Напрыклад, прычыны, з якіх работніку налічваецца заработная плата, ніжэйшая за мінімальную. Таксама фонд назапашвае звесткі па прафесійным пенсійным страхаванні — пры рабоце ў небяспечных і шкодных умовах, што дае права на дадатковыя адлічэнні на будучую прафесійную пенсію.

Магчыма, з'явіцца і інфармацыя аб добраахвотным пенсійным страхаванні. На сёння ўдзельнікамі добраахвотнай накапляльнай сістэмы пенсійнага страхавання з фінансавай падтрымкай дзяржавы сталі ўжо 12 тысяч беларусаў. У дадатку можна будзе даведацца, колькі назапашана сродкаў і якая капіталізацыя.

Яшчэ адзін магчымы крок, які сёння абмяркоўваецца, — прагназаванне памеру будучай пенсіі.

— На партале ФСАН ёсць калькулятар, дзе пры ўказанні пэўных параметраў ёсць магчымасць разлічыць будучую пенсію. Час пакажа, ці трэба дубляваць такую магчымасць у мабільным дадатку, — кажа спецыяліст.

На працягу лютага на адрас электроннай пошты фонду можна даслаць свае прапановы і заўвагі па рабоце мабільнага дадатку. А вось калі вы заўважылі праблему або інфармацыю, якая вас насцярожвае ці з'яўляецца, на ваш погляд, няправільнай, звяртайцеся з пашпартам у тэрытарыяльны фонд сацыяльнай абароны, каб высветліць, як дзейнічаць далей і выправіць памылку.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПАЛЯНАЎСКІЯ «АЎСТРАЎЛЯНЕ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

І для жыхароў лецішча, і для месцічаў пасёлка Палянаўка ўжо другі раз з пачатку паводкі прыйшла гуманітарная дапамога ад Беларускага Чырвонага Крыжа. Валанцёры каманды рэагавання Гомельскай абласной арганізацыі БЧК і супрацоўнікі Веткаўскай выратавальнай станцыі вязуць у пасёлак на санях прадуктовыя наборы. Просьбы аб той ці іншай дапамозе палянаўскія пенсіянеры перадаюць праз ратавальнікаў. Непасрэдна па тэлефоне жыхары пасёлка і садовага таварыства звязваюцца, калі неабходна дабрацца з Палянаўкі. Самастойна і неарганізавана перасякаць гэты без нечага кіламетровы адрэзак замерзлай поймы ратавальнікі катэгарычна забараняюць.

— Лёд на гэтым шырокім падтопленым участку неаднастайны — ёсць месцы з таўшчынёй лёду больш за 10 сантыметраў, а там, дзе плынь, — таўшчыня менш за 10 сантыметраў, што вельмі небяспечна для пераходу нават невялікай групы людзей, — перасцерагае **спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства выратавання на водах Мікіта ЛІСОЎСКІ.**

Ужо былі выпадкі, калі людзі самі выходзілі на лёд і праваліваліся. На шчасце, усё абышлося, кажуць ратавальнікі. Спецыялісты Веткаўскай выратавальнай станцыі Таварыства выратавання на водах абышлі ўсіх жыхароў і з кожным правялі індывідуальную гутарку: пераканалі, што самастойна выходзіць на лёд, асабліва па незацверджаным маршруце, вельмі небяспечна.



## Трымацца сцежкі

Абавязкова ўсе, хто выходзіць на лёд, мусяць быць у выратавальных камізэльках, прайсці інструктаж па тэхніцы бяспекі ад ратавальніка. Падчас руху па лёдзе неабходна трымацца дыстанцыю не менш за пяць-сем метраў, каб мінімізаваць нагрузку на пэўных участках. Аранжавы ланцужок фігур людзей добра відаць на белай роўнядзі замёрзлай поймы. Цяпер па лёдзе дарога ў Палянаўку нашмат карацейшая, чым калі была лодачная пераправа. Маршрут падрыхтаваны вельмі грунтоўна.

— Перад пачаткам дзяжурства праводзіцца разведка таўшчыні лёду, увесь маршрут прастукваецца, вымяраюцца самы тоўсты і самы тонкі ўчасткі. Па самым тонкім — таўшчыня лёду не павінна быць менш за 7-9 сантыметраў з разліку да 100 кілаграмаў на аднаго чалавека. Ёсць участкі, дзе таўшчыня лёду і 30 сантыметраў. Маршрут устанаўлівалі 29 студзеня, тады мы на гэтым участку абышлі кожны метр і выбралі самы бяспечны кірунак для пешай сцежкі. Маршрут зацвердзілі і кожны дзень пераправяраем, — звяртае ўвагу на слупкі-маячкі і стужку ўздоўж сцежкі (тыя месцы дзе самы тонкі лёд) **выконваючы абавязкі начальніка Веткаўскай выратавальнай станцыі Таварыства выратавання на водах Сяргей СІЛКІН.**

За дзень дзяжурным яго падраздзялення даводзіцца каля сямі разоў схадзіць у Палянаўку, каб перавесці людзей. Гэта без уліку таго, што ратавальнікам яшчэ трэба самім дабрацца да вёскі, каб прынесці выратавальныя камізэлькі. Пік пераходу — з шасці гадзін раніцы, калі людзям трэба перабрацца на сушу, каб ехаць на працу ў горад. Жыхары Палянаўкі, хваляць ратавальнікі, вельмі дружна і арганізавана падыходзяць да пытання. Збіраюцца па пяць-сем чалавек, каб перайсці за адзін рэйс. Просяць правесці па лёдзе ў магазін па прадукты, у школу, амбулаторыю. Ужо былі просьбы даставіць у пасёлак работнікаў электрасетак, газавай службы. Дзяжураць на маршруце ратавальнікі да дзесяці гадзін вечара. У начны час на экстранныя выклікі рэагуюць ужо спецыялісты МНС.



## Лядовы кардон

Самаму маленькаму жыхару адрэзанага паводкай садовага таварыства — два гадкі. Вова разам з маці і братам Уладзіславам амаль штодзень у суправаджэнні супрацоўнікаў Таварыства выратавання на водах перасякаюць шлях па лёдзе ад свайго дому да ўскраіны аграгарадка Старое Сяло. Гэта ўжо «вялікая зямля»: можна на транспарце дабрацца да Гомеля. Сям'я Колыхавых зімуе на лецішчы чацвёрты год. Але і без горада нікуды: муж працуе ў абласным цэнтры, некалькі разоў на тыдзень наведвае спецыялізаваную школу старэйшы сын. Выбіраюцца Святлана з хлопчыкамі і час ад часу да доктара ў горад. Цяпер без дапамогі ратавальнікаў не абысціся. Апрануўшы дзяцей і жанчыну ў выратавальныя камізэлькі, спецыялісты Таварыства выратавання на водах праводзяць па лёдзе сям'ю да садовага таварыства.







## «Мы — рамантыкі на востраве»

Калі лядовы кардон пераадолены, яшчэ амаль два разы па столькі ж, як па лёдзе, да Палянаўкі дабірацца пешшу ўздоўж поля. Валанцёраў Беларускага Чырвонага Крыжа ўжо чакаюць палянаўскія мужчыны: прыгналі міні-трактар, каб давезці сані з грузам і людзей у пасёлак. Тут іх сустракаюць як добрых знаёмых.

— Кажуць, што бяда гуртуе, а мы і так заўсёды былі дружныя ў вёсцы. Цяпер толькі што часцей бачымся, збіраемся, — перадае настрой аднавяскоўцаў Ала Антоненка. Усе палянаўскія сем'і, а жыве ў пасёлку 21 чалавек, высыпалі на вуліцу сустракаць гасцей.

— Мы — рамантыкі на востраве, — кажа Ала Антоненка. — У мінулыя гады, калі вада прыходзіла вясной, было нармальна. Бо практычна ў кожнай сям'і свае лодкі, таму мужчыны паехалі, прывезлі, што трэба. Не прыходзілася звяртацца, каб столькі сіл дзеля нас задзейнічалі. Мы абавязкова будзем пісаць ліст з падзякай у Таварыства выратавання на водах, будзем прасіць, каб адзначылі службу хлопцаў і асабліва Сяргея Васільевіча Сілкіна, бо ён дапамагае нам вырашыць любую праблему, званім яму асабіста. Удзячныя мы і старшыні нашага сельскага Савета, які не пакідае нас без увагі, — прашу перадаць ад імя ўсіх жыхароў Палянаўкі.

Палянаўскія «астраўляне» спадзяюцца на больш спакойную вясновую паводку.

— Думаем, хопіць ужо з нас, чакаем вясны. Я ўжо, калі хадзіла ў аграгарадок, грунт купіла, расаду трэба сеяць, а як жа! А так па прадукты некаторыя ходзяць, я хаджу рабіць уколы ў нашу амбулаторыю, а так без справы імкнёмся не хадзіць, вядома, каб не моцна трывожыць хлопцаў-ратавальнікаў, — дзеліцца Ніна Кавалькова. — Дачка і сын у горадзе перажываюць, просяць, каб не хадзілі самі па лёдзе ні ў якім разе. Званяць-перажываюць і сябры, усе нас падтрымліваюць.

Не можа выйсці на вуліцу, таму сустракае гасцей з гасцінцамі праз акно адна з найстарэйшых жыхарак пасёлка Зінаіда Радзівонаўна Целяпнёва.

— Азёры тут з двух бакоў, а мы як зайцы на востраве, — кажа жанчына. — Мне хутка 85 гадоў, жыву адна, а дзеці ў Гомелі. Настойваюць, каб мяне забраць, а я не хачу ў кватэру, супрацьўляюся.

## Гатовыя адрэагаваць аператыўна

Мэта візіту ў населены пункт валанцёраў Беларускага Чырвонага Крыжа — не толькі перадаць харчовыя наборы, але і ацаніць індывідуальныя патрэбнасці найбольш уразлівых катэгорый людзей, дапамагчы пры неабходнасці ім адрасна, звяртае ўвагу **начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Арцём КАРПЕНКА.**

— Беларускі Чырвоны Крыж узаемадзейнічае з упраўленнем МНС Гомельскай вобласці, абласной арганізацыяй Таварыства выратавання на водах, якія маніторацць паводкавую сітуацыю ў рэгіёне. У выпадку неабходнасці мы гатовыя прыбыць на дапамогу да людзей у любым населеным пункце вобласці.

У Палянаўку прывезлі гуманітарную дапамогу другі раз. Цяпер уразлівых грамадзян, якія не могуць, як раней, пераплываць на лодцы разам са спецыялістамі Таварыства выратавання на водах, больш. У вёсцы шмат людзей у сталым узросце, якія з прычыны фізічнага стану не могуць пайсці пешшу па лёдзе. Зразумела, што цяпер і аўтакрамы не могуць даехаць, таму было прынята рашэнне здзейсніць у населены пункт другі рэйд з дапамогай. Каб не толькі даставіць прадукты харчавання, але і яшчэ раз ацаніць патрэбнасці людзей у адраснай гуманітарнай дапамозе. Мы будзем і надалей сачыць за развіццём сітуацыі, калі яна будзе пагаршацца, зноў прыбудзем з дапамогай. Калі ў іншых населеных пунктах таксама будзе неабходнасць у падтрымцы нашых валанцёраў і дастаўцы гуманітарнага грузу, мы гатовыя аператыўна адрэагаваць, — падкрэсліў Арцём Карпенка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.**

*Веткаўскі раён.*

### У тэму

Гомельскае абласное ўпраўленне МНС вядзе штосутачны маніторынг паводкавай сітуацыі ў рэгіёне. У некаторых раёнах узровень вады ў рэках крыху падае, дзесьці працягвае расці. Усяго па вобласці падтоплена больш за паўтысячы нежылых і дачных дамоў, 17 жылых дамоў, некалькі ўчасткаў дарог. На асаблівым кантролі сітуацыя ў Петрыкаўскім, Мазырскім, Жлобінскім раёнах, а таксама ў Гомелі. Камісіяй па надзвычайных сітуацыях Гомельскага аблвыканкама ўзгоднены міжведамасны план узаемадзеяння для прыняцця мер рэагавання ў адпаведнасці з сітуацыяй. Створаны рэзерв больш за 200 месцаў, куды пры неабходнасці будуць эвакуіраваны жыхары падтопленых тэрыторый. Вызначана тэхніка для транспарціроўкі людзей.

Зварот у рэдакцыю

# ГЭТАЕ НЕВЫНОСНАЕ СМЕЦЦЕ...

*«У нашым двары насупраць і ў сямі кроках ад вокнаў паставілі кантэйнеры для смецця, і цяпер жыльцы найбліжэйшых дамоў, інтэрната, а таксама дачнікі, што праязджаюць міма, прыносяць і прывозяць сюды пакеты. Апошнія не саромеюцца: каб разгрузіцца, заязджаюць проста ў двор на машынах ды матаблоках, здараецца, пакідаюць смецце ля бакаў, — скардзілася* **Людміла Быкава з аг. Негарэлае, што на Дзяржыншчыне.** *Яна ж распавядала, што ў студзені машына забрала смецце з кантэйнераў, а вялізны мяшок, які стаяў побач, грузчыкі пакінулі. Чаму так адбываецца?»*

Па адказы на гэтыя пытанні рэдакцыя «Звязды» звярнулася ў Дзяржынскую ЖКГ. Там растлумачылі, што мяшкі з рэшткамі цэменту, бітага бетону і шыферу, старая мэбля ды іншы буйнагабарытны хлам каля кантэйнерных пляцовак — з'ява, на жаль, звычайная. Каб ліквідаваць праблему стыхійных звалак, у раёне вырашылі змяніць падыход да сістэмы збору смецця. На сёння значную частку кантэйнерных пляцовак з металічнымі бакамі дэманціравалі, а сельскія населеныя пункты, у тым ліку і аграгарадок Негарэлае, перавялі з кантэйнернага спосабу абслугоўвання на падворны аб'езд.

Як паведамляецца ў афіцыйным адказе за подпісам **генеральнага дырэктара УП «Дзяржынская ЖКГ» Веры КРАСОЎСКАЙ,** на сёння вываз смецця ў Негарэлым ажыццяўляецца адзін раз на тыдзень — у сераду. Каб палепшыць якасць абслугоўвання жыхароў шматкватэрных дамоў, былі ўстаноўлены герметычныя еўракантэйнеры для збору цвёрдых камунальных адходаў.

Падчас праверкі звароту Людмілы Быкавай з выездам на месца спецыялісты ЖКГ устанавілі, што два еўракантэйнеры знаходзяцца на адлегласці 16 метраў ад вокнаў шматкватэрнага дома. Гэта сапраўды блізкавата. Таму пры наступленні спрыяльнага надвор'я іх перасунуць: «Плануецца ўладкаваць цвёрдую падстаўку пад кантэйнеры, на будзе аддаленая ад вокнаў дома не менш як на 20 метраў (згодна з нарматывамі)».



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— Побач з домам, у якім жыве заяўніца, праходзіць траса, таму па дарозе з дач людзі сапраўды заязджаюць у двор, каб выкінуць смецце, — дадала **начальнік аддзела па зваротах грамадзян і ідэалагічнай рабоце УП «Дзяржынская ЖКГ» Таццяна СВІРСКАЯ.** — У нас ёсць варыянты рашэння і гэтага пытання. У найбліжэйшы час прымем меры, каб з дарогі смецевыя кантэйнеры не так кідаліся ў вочы.

— Што датычыцца «забытага» на пляцоўцы мяшка, які згадваўся ў звароце, то ў ім было будаўнічае смецце. На жаль, не ўсе разумеюць, што кантэйнеры прызначаны выключна для бытавых адходаў, — удакладняе Таццяна Свірская. — Будаўнічыя матэрыялы ў іх выкідваць нельга. Забаронена складзіраваць іх і на кантэйнерных пляцоўках. Аб гэтым, як і аб тым, што буйнагабарытнае, раслiннае смецце мае свой парадак утылізацыі, мы пастаянна інфармуем жыхароў у тэлеграм-канале і праз СМІ. Пустазелле пасля праполкі, сукі пасля абрэзкі саду, лісце, падгнілыя яблыкі ды слівы можна вывозіць на палігон, раслiннае смецце там прымуць бясплатна. Жыхарам прыватнага сектара на сваіх участках мы рэкамендуем абсталяваць ямы для кампосту. На будаўнічы і буйнагабарытны хлам афармляецца асобная заяўка — такое смецце павінна вывозіцца за дадатковую плату. Калі ж на кантэйнерных пляцоўках заўважаюцца стары лінолеум, дзверы ды вокны, абрыўкі шпалер, няцяжка зразумець, што недзе ў суседнім доме робіцца рамонт. Мы «вылічваем» гэтыя кватэры, заходзім, тлумачым... Здараецца, іх гаспадары проста не ведалі, што будаўнічае смецце трэба вывозіць на палігон. Магчыма, такую інфармацыю варта размясціць на кантэйнерных пляцоўках. Але мне здаецца, што пакуль не будзем караць рублём, не ўсе зразумеюць і пойдуць насустрач...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Ведай нашых!

# У ВОСЕМДЗЕСЯТ ПЯЦЬ

## вышываць, танцаваць, спяваць? Ды калі ласка!

**У гэтым, сабраўшыся на ўрачыстасць, пераканаліся госці Ніны Мікалаеўны Тысевіч. Юбілей шматдзетная мама і знаны народны майстар адсвяткавала гучна і прыгожа. Прынамсі, у залу (з падачы мясцовых работнікаў культуры) выходзіла як сапраўдная знакамітасць — па чырвонай дарожцы, абапал якой стаялі госці і віталі яе апладысментамі... Можа, таму што ведалі, якімі няпростымі былі для жанчыны ўсе яе гады.**



### Шчасце любіць працавітых

З дзяцінства Ніна спазнала смак слёз і такога ж салёнага поту: з пяці гадоў застаўшыся без бацькі, яна дапамагала маці гадаваць маленькага брацька, глядзець гаспадарку, вазіць з лесу дровы, касіць і сушыць сена... У 13 гадоў разам з сяброўкамі хадзіла ў Івацэвічы (за 20 кіламетраў!) па хлеб. Гора было, калі ёй не даставалася ні бохана (у чаканні — спалі на вакзале на падлозе), і такое ж вялікае шчасце, калі здабывала аж пяць!

Там жа, у Івацэвічах, Ніна «была ў няньках» і глядзела не толькі малых, — прыбірала, гатавала, на работу гаспадарам насіла абеды, мыла бялізну. Мусіла ўсё паспяваць, каб зарабіць капейчыну.

Дзеля гэтага ж трохі пазней і разам з дзяўчатамі махнула ў Днепрапятроўскую вобласць. Чаго яны там толькі ні рабілі: студні капалі, вугаль грузілі, авечак стрыглі, салому вазілі...

І ўсё б нічога, але навалілася засуха, і грошай, што атрымала, Ніне хапіла толькі на коўдру.

Вярнуўшыся з ёю дадому, дзяўчына зноў пайшла працаваць, а па вечарах... танцаваць. Той самай зімой, на вячорках, яна пачула гармонік Івана Тысевіча і прапала: у 17 гадоў выйшла замуж, разам сталі будаваць хату, дзе пражылі потым 63 гады. Больш за 20 з іх Ніна Мікалаеўна працавала даяркай, шчыравала ў брыгадзе... Ні разу гэтая жанчына не была ў дэкрэтным водпуску і ніколі не скардзілася на жыццё. З божай ласкай сужэнцы Тысевічы нарадзілі і выгадавалі пяцёра дзяцей. У Ніны Мікалаеўны сямёра ўнукаў і дзевяць праўнукаў. Вялікая сям'я, вялікая радня...

І сяброўак багата, бо жанчына заўсёды да ўсіх — з увагай, з любоўю: умее ладзіць з людзьмі, любіць прымаць гасцей, а ўжо гатаваць... І пірагі, і каўбасы, і грыбочкі, і сырочкі, і налівачка — усё як мае быць!

Але ж не хлебам адзіным, як той казаў: пасля цяжкай працы (вялікая сям'я — такая ж гаспадарка) жанчына хацела спяваць. «Я ж з Аброва, — казала, — там усе пяюць!» А значыць, яна таксама — даўнейшыя песні пра вёску, долю, каханне, матуліну калыханку: 17 гадоў выступала ў мастацкай самадзейнасці. І каб толькі...

### «Без іголкі з ніткай я, здаецца, дня не пражыву!

У 2009-м Ніне Тысевіч першай у Івацэвіцкім раёне было прысвоена званне «Народны майстар Рэспублікі Беларусь». Калі і як яна вучылася ткаць ды вышываць, сама не прыпомніць. Як не ведае і таго, адкуль у яе талент маляваць.

— Некалі модна было вышываць хусткі, кашулі, сурвэткі, — успамінае майстрыха, — дык многія тутэйшыя жанчыны прыходзілі, прасілі, каб намалявала ўзоры. Ніхто мяне гэтаму не вучыў, але ўсё, што хочацца вышыць, я вазьму і намалюю... Без іголкі з ніткай я і дня не пражыву! Мяне, здаецца, звяжы — а вышываць я ўсё роўна буду! Прычым у руках, пад іголкай, адзін узор, а ў галаве ўжо другі, трэці...

Нітачка да нітачкі, крыжык да крыжыка — і з'яўляюцца на свет новыя рукатворныя цуды: ручнікі, навалачкі, прасціны, накідкі, тканыя палавікі і палавічкі... Як расказвалі работнікі культуры, у доме Ніны Мікалаеўны жыве нацыянальны каларыт, там міжволі вяртаешся ў дзяцінства і адчуваеш сябе шчаслівым...

Колькі рэчаў стварыла за жыццё, Ніна Мікалаеўна кажа, не лічыла. Хіба наўскідку? Выткала больш за 50 радзюжак і розных ходнікаў, вышыла звыш 300 ручнікоў, падзорнікаў і карцін. Выстаўка яе работ знаходзіцца ў мясцовым Доме культуры, яе набожнікі аздабляюць абразы ў Свята-Міхайлаўскім храме, яе вышыванкі знаходзяцца ў калекцыях жыхароў Амерыкі, Германіі, Польшы, Бельгіі, Расіі і па ўсёй Беларусі. Вось і ў дзень юбілею майстрыха не здрадзіла сабе — ці не ўсіх гасцей адарыла сваімі ручнікамі. Прыемныя сюрпрызы! І яшчэ ж не ўсё! Як той казаў, трымайцеся:

### Прычэп дроў — за тры дні... Ну чаму б і не!

Так-так, перад Калядамі Ніна Мікалаеўна заказала сабе дровы. Яе не падвялі — прывезлі, і гаспадыня сама за тры дні (ну з паловай...) іх пакалола.

Гэта — бронь божа! — не значыць, што дзеці ёй не хочуць памагаць. Яны ў выхадныя ўжо сабраліся, а дровы, глядзяць, пасечаны.

Родным дачушкам-сынкам, ну вядома ж, за шчасце, што ў іх такая мама: добрая, строгая, вясёлая, працавітая (гэтым летам, дарэчы, сабрала за дзень 28 кілаграмаў чарніц!), а ўжо вясёлая...

Трэ было бачыць, як яна ў сваe 85 танцавала — з загадчыцай мясцовага СДК, з унукам, сынам, са стрыечнымі пляменніцамі з Калінінграда, з самадзейнымі артыстамі. І (здзіўляць дык здзіўляць!): то з імі, то з сяброўкамі, наперабой, юбілярка спявала гэткія заліхвацкія прыпеўкі...

Пасля знаёмства з Нінай Мікалаеўнай я доўга думала, як можа адзін чалавек столькі паспяваць, столькі аддаваць — рабіць для іншых?

Адказ знайшоўся ў кніжачцы свяціцеля Іаана Залатавуста: крыніцы, чым больш з іх чэрпаюць, тым больш напаўняюцца чыстай вадой...

Ёсць такія крыніцы. І такія людзі: чым больш яны аддаюць, тым больш ім даецца сіл.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы.*
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.**

Усмешачку!

# Нуль з палачкай і без...

**Не мной заўважана: унукаў бабулі з дзядулямі любяць больш, чым дзяцей, і расказваць пра іх гатовыя бясконца. Цікавыя бываюць аповеды! Штосьці з пачутага я ўзяўся запісваць. Ну вось...**

Максім са школы прыйшоў заклапочаны. Кажа бабулі:

— Ты ведаеш, а ў нашай настаўніцы так дрэнна з матэматыкай...

— З чаго ты ўзяў?

— Ну колькі будзе, калі да адзінкі прыбавіць нуль?

— Адзінка...

— Дык не і яшчэ раз не! Ты таксама не ведаеш матэматыкі. Вось паглядзі...

Максім малюе на паперы палачку, побач прыпісвае нуль.

— Бачыш, — заяўляе, — атрымалася дзесяць! Так?!

Бабулю выручае жыццёвы досвед:

— Максім, а што такое нуль? — пытаецца ў дзіцяці. — Ды гэта ж нічога! Яго колькі ні прыкладай, болей не стане. Ну вось уяві: у цябе ёсць адзін яблык. Я не дала табе ніводнага (нуль!), і мама — нуль, і дзед з бацькам. У цябе пасля гэтага яблыкаў стала болей?

— Не, — залыпаў вачыма хлопчык.

— Твая памылка ў тым, што ты не прыбавіў нуль да адзінкі, а прыставіў... Дадаваць і прыстаўляць — гэта розныя рэчы, зразумеў?

— А як жа! Ты, бабуля, сапраўдная настаўніца, — прызнаў унук.

Як ордэн жанчыне выдаў!

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ СУПРАЦЬ РАКУ

## Анколагі расказалі, як лечаць пацыентаў, якія раней лічыліся неперспектыўнымі

**З 2020 года, калі пачалася пандэмія каранавіруснай інфекцыі, анколагі пачалі адзначаць змяншэнне колькасці новых выпадкаў раку. Калі ў 2019 годзе ў Беларусі было выяўлена 54 тысячы новых пацыентаў, то ў 2022 годзе — 50 тысяч. Пры гэтым смяротнасць ад анкалагічных хвароб таксама змяншаецца. У апошнія 10 гадоў колькасць памерлых ад злаякасных наватвораў у краіне была прыкладна аднолькавай і вагалася ў межах 18 тысяч. Напрыклад, у 2019 годзе з такіх прычын памерла 18 800 беларусаў, а вось у 2022-м — на 4 тысячы менш. Пакуль анколагі не бяруцца называць прычыны зніжэння колькасці новых выпадкаў раку, але падкрэсліваюць, што гэта не звязана са змяншэннем зваротаў да медыкаў падчас пандэміі.**

**Тым часам ва ўсім свеце анкалогія з'яўляецца адной з тых галін медыцыны, якія інтэнсіўна развіваюцца: ледзь не штодзень з'яўляюцца новыя лекі і метады лячэння розных відаў пухлін, і Беларусь тут — не выключэнне. У РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава штогод рэалізуецца ад 50 да 70 навуковых праектаў. Вядучыя анколагі расказалі пра новыя метады лячэння, якія яшчэ нядаўна былі недаступныя, а сёння выратоўваюць жыцці пацыентам.**

### КУРЦЫ ПАД ПАГРОЗАЙ

Адзін з навуковых праектаў — распрацоўка новых метадаў лячэння паражэння пазваночніка. Як адзначае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей КРАСНЫ,** раней пацыенты з пярвічнымі пухлінамі пазваночніка ці метастазамі ў пазваночнік былі практычна асуджаны на нерухомасць, нягледзячы на тое, што працягласць іх жыцця магла быць значнай дзякуючы поспехам супрацьпухліннага лячэння. Цяпер распрацаваны новыя аперацыі на пазваночніку, калі разбураныя пазванкі выдаляюцца і замяняюцца пратэзамі (ужо маюцца пратэзы пазванкоў беларускай вытворчасці) ці выконваюцца розныя фіксацыйныя аперацыі.

— Пацыенты пасля іх могуць весці практычна звычайны спосаб жыцця і нават часам вяртацца да працы. Пры неабходнасці яны маюць магчымасць атрымліваць прызначанае супрацьпухліннае лячэнне. Такім чынам, прынцыпы лячэння пацыентаў дадзенага кірунку кардынальна мяняюцца ў нас на вачах, — кажа Сяргей Красны.

Яшчэ адзін праект, які прадэманстраваў высокую эфектыўнасць, — выяўленне раку лёгкага ў курцоў. Скрынінгавая праграма заканчваецца ў 2024 годзе, але ўжо цяпер відавочныя поспехі. Курцам праводзіцца нізкадозная камп'ютарная тамаграфія, і такое даследаванне прайшло ўжо больш за 1,5 тысячы чалавек. У 30 з іх, а гэта каля 2 %, выяўлены рак.

— Гэта надзвычай вялікая лічба, — каментуе Сяргей Красны. — У сярэднім падчас скрынінгавых даследаванняў пухліны выяўляюцца ў 0,5 %. Такім чынам, правільна была абрана мэтавая аўдыторыя. У 70 % з іх — 1-2 стадыя захворвання, што для раку лёгкага грандыёзны крок наперад, бо ў цэлым у папуляцыі 1-2 стадыі выяўляюцца менш чым у 40 %. Натуральна, і вынікі лячэння ў гэтых пацыентаў кардынальна адрозніваюцца.

Новы праект — 3D-мадэляванне аперацыйных умяшанняў. У асноўным ён прызначаны для пацыентаў з запушчанымі пухлінамі, у першую чаргу, пухлінамі лёгкага з распаўсюджаннем на буйныя сасуды і структуры сэрца. З дапамогай адмысловых праграм мадэлюецца будучая аперацыя на камп'ютары. Вызначаюцца яе аб'ём, месцы рэзекцыі пашкоджаных органаў, магчымасць захавання лёгкага ў выпадку, калі парушана функцыя дыхання. Затым прымаецца рашэнне аб аб'ёме аперацыі і хірург падчас яе кіруецца распрацаванымі рэкамендацыямі.

— Гэта істотна зніжае колькасць ускладненняў падчас аперацыі, бо нават самая малая памылка на сэрцы ці буйных сасудах можа прывесці да смерці пацыента з-за страты крыві, — адзначае Сяргей Красны. — Акрамя таго, у шэрагу выпадкаў удаецца захаваць часткі лёгачнай тканкі, што забяспечвае здавальняючую якасць жыцця пацыента. Сёння выканана больш за 50 такіх аперацый з вельмі добрым вынікам. Дадзены кірунак будзе і далей развівацца, прычым не толькі з ракам лёгкага, але і пры іншых злаякасных пухлінах.

### КЛЕТАЧНАЯ ТЭРАПІЯ

Сёння ў Беларусі малекулярна-генетычныя даследаванні праводзяцца па цэлым шэрагу кірункаў. Яны дапамагаюць вызначыць адчувальнасць да лекавых сродкаў, што важна пры падборы хіміятэрапіі, спрагназаваць захворванне, бо па пэўных мутацыях можна вызначыць развіццё пухліны. Акрамя таго, малекулярна-генетычныя даследаванні дазваляюць вызначыць схільнасці да злаякаснай пухліны. А даследаванні па клетачнай тэрапіі дапамагаюць справіцца з некаторымі відамі раку ў дзяцей. Адзін з такіх кірункаў — прымяненне CAR-T-клетак.

— Гэта асаблівая канструкцыя, якая накіравана на тое, каб навучыць уласныя лімфацыты распазнаваць і знішчаць пухлінныя клеткі. Яна рыхтуецца па-за арганізмам: бяруцца ўласныя лімфацыты пацыента, і ў лабараторных умовах ідзе складаны карпатлівы працэс іх падрыхтоўкі і «навучання» да таго, каб пасля ўвядзення ў арганізм чалавека яны змаглі распазнаць і знішчыць пухлінную клетку, — тлумачыць **намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, кандыдат медыцынскіх навук Марына БАРЫСЕВІЧ.** — У нашым цэнтры даследаванні вядуцца з 2018 года, а першая тэрапія з прымяненнем CAR-T-клетак выканана пацыенту ў 2019 годзе. Такім метадам ужо пралячылі 10 пацыентаў, і ў 8 атрымалі



добры адказ. Гаворка ідзе пра пацыентаў з вострымі лімфабласнымі лейкозамі і няходжкінскімі лімфомамі, якія развілі рэфрактарнасць — неўспрымання стандартных метадаў.

Такі падыход падарыў шанц на жыццё тым пацыентам, якія яшчэ нядаўна лічыліся неперспектыўнымі.

— Чаму толькі лейкозы і лімфомы? Мы ўздзейнічаем на пэўную мутацыю і мусім мець пэўны антыген, каб навучыць лімфацыты нападаць на адпаведную пухлінную клетку. Пры лейкозах звычайна маецца адна мутацыя, таму лячэнне найперш выкарыстоўвалася пры гэтай хваробе. Пры лімфомах сітуацыя крыху больш складаная, але вельмі блізкая, — дадае Сяргей Красны. — А вось пры солідных пухлінах іншых лакалізацый звычайна маецца вялікая колькасць розных мутацый, і навучыць лімфацыты нападаць на гэтыя пухлінныя клеткі пакуль нікому не ўдалося.

Тым не менш, гэта перспектыўны і вельмі запатрабаваны метад лячэння, у тым ліку і для замежных пацыентаў, бо ў свеце яго кошт дасягае 500 тысяч еўра.

— Апошнім часам мы адчуваем попыт на CAR-T-клетачную тэрапію ў пацыентаў, у тым ліку замежных, з вострымі лімфабласнымі лейкозамі, бо гэта мосцік перад выкананнем трансплантацыі ствалавых клетак. У сукупнасці гэтыя два метады ў Заходняй Еўропе вельмі дарагія, кошт даходзіць да 500 тысяч еўра. Толькі адна CAR-T-канструкцыя дасягае 250 тысяч еўра. У нас увесь метад абыходзіцца ў суму каля 55 тысяч долараў, адна канструкцыя — каля 25 тысяч долараў, — кажа Марына Барысевіч.

### УНІКАЛЬНАЯ ВАКЦЫНА

З гэтага тыдня ў Беларусі пачынаецца працэс маштабнай вытворчасці супрацьракавай вакцыны «Еленаген». Плануецца выраблять тысячу флаконаў у тыдзень. Гэта задаволіць патрэбу Беларусі для лячэння пацыентаў і шырокамаштабных навуковых даследаванняў. Больш нідзе ў свеце яна не выпускаецца.

Прэпарат даказаў сваю эфектыўнасць і прызнаны амерыканскімі анколагамі найлепшым у свеце пры хіміярэзістэнтным раку яечніка.

— Гэта высоказлаякасная пухліна, якая на працягу года-паўтара прыводзіць да смерці пацыента. Хіміятэрапія ўжо неэфектыўная, а вакцына «Еленаген» дазволіла падняць яе эфектыўнасць і атрымаць унікальны вынік, — кажа Сяргей Красны. — Сярэдні час да прагрэсіравання захворвання павялічваўся ў 2,5 раза, а ў 40 % пацыентак назіраецца доўгі перыяд без прагрэсіравання — тры гады, менавіта столькі, колькі праводзіцца даследаванне. Па гэтым напрамку плануецца рэгістрацыя прэпарату ў Беларусі. Па астатніх даследаванні працягваюцца. Найперш гэта рак малочнай залозы і прастаты. Там вынікі абнадзейваюць, але не дасягнулі статыстычна значнай розніцы.

Варта дадаць, што прэпарат уплывае на мікраатачэнне пухліны, павялічваючы пранікальнасць яе ахоўных абалонак для хіміяпрэпаратаў і імунных клетак. У выніку пухліна страчвае сваю магчымасць абараняцца ад нашага імунітэту. Аднак гэта ўсё ж не панацэя.

— Напрыклад, пры раку страўніка «Еленаген» аказаўся зусім неэфектыўным. Пры раку падстраўнікавай залозы эфектыўнасць была абмежаваная, і ўлічваючы дэфіцыт дадзенага прэпарату, мы спынілі даследаванне, вырашыўшы праводзіць яго ў тых напрамках, дзе эфект найбольш выразны, — звяртае ўвагу Сяргей Красны.

### ШТО ПРЫВАБЛІВАЕ ЗАМЕЖНІКАЎ У НАШЫХ АНКАЦЭНТРАХ?

У Беларусі лечаць ад раку і замежных пацыентаў. Падчас пандэміі іх колькасць знізілася, і сёння большасць замежнікаў прыязджае з Расіі і краін Сярэдняй Азіі. Ёсць пацыенты з Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі. За год РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава прымае 2-2,5 тысячы замежных грамадзян. Пэўная частка пацыентаў лечыцца ў Мінскім гарадскім анкацэнтры і ў абласных.

— Запатрабаванай з'яўляецца ёдатэрапія, якая прымяняецца пры раку шчытападобнай залозы ў Мінскім гарадскім анкацэнтры і Гомельскім абласным анкадыспансеры, — кажа **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Сяргей ПАЛЯКОЎ.** — Акрамя таго, запатрабавана 3D-мадэляванне, бо ў некаторых выпадках на радзіме пацыентам адмаўляюць у аперацыі, а мы бачым, што яна магчымая. Прыцягваюць пацыентаў унікальныя магчымасці прамянёвай тэрапіі, у прыватнасці парк сучасных апаратаў для яе існуе ў мінскім анкацэнтры, і яму можа пазайздросціць любы анкалагічны цэнтр свету. У нашым РНПЦ выкарыстоўваецца гама-нож — сучасны напаўрабатазываны комплекс для лячэння пухлін галаўнога мозга розных лакалізацый — ад пярвічных пухлін да метастазаў.

**Галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Віктар КАНДРАТОВІЧ** расказаў, што летась тут пралячылася каля 400 замежных грамадзян. Запатрабаваныя ўсе віды дапамогі: хірургічная, прамянёвая і хіміятэрапія. З 1990-га працуе Цэнтр пухлін шчытападобнай залозы. На яго базе існуе аддзяленне ядзернай медыцыны на 20 ложкаў. Яно ўведзена ў 2017 годзе і зроблена па апошнім слове тэхнікі, у тым ліку абсталявана спецыяльнымі відамі каналізацыі і водазабеспячэння, ахоўнымі рэжымамі. З улікам невялікага кошту лячэння ў замежнікаў яго запатрабаванасць высокая. У 2017 і 2020 гадах дзвюма чэргамі быў здадзены новы радыялагічны корпус. На яго базе працуе шэсць лінейных паскаральнікаў — такім паркам валодае няшмат анкацэнтраў у Еўропе.

Усяго ж сталічны анкацэнтр разлічаны на 674 ложкі.

— Для Мінска гэтага пакуль дастаткова. На ўліку ў нашай установе стаіць больш за 83 тысячы мінчан. Яны атрымліваюць ці ўжо атрымалі лячэбную дапамогу і знаходзяцца ў стане рэмісіі. Паказчыкі работы суадносяцца з сярэднімі паказчыкамі еўрапейскіх краін. Напрыклад, пяцігадовая выжывальнасць складае больш за 60 %, — дзеліцца Віктар Кандратовіч.

### ВЫЯВІЦЬ НА РАННЯЙ СТАДЫІ

Як адзначае Сяргей Палякоў, у краіне пасля пандэміі аднавіліся скрынінгавыя праграмы.

— Скрынінг дапамагае выявіць пухліну пэўнай лакалізацыі на ранняй стадыі. Ён прадугледжвае актыўнае запрашэнне пацыентаў на абследаванне. Мы бяром тую групу насельніцтва, у якой часцей за ўсё можа выяўляцца гэтая пухліна і каму па ўзросце яна можа нанесці найбольшую шкоду, і імкнёмся тых пацыентаў абследаваць на рак.

У нашай краіне праводзіцца скрынінг чатырох лакалізацый: рак шыйкі маткі, малочнай залозы, прастаты, колараэктальны рак.

— Колараэктальны рак мае шырокую распаўсюджанасць і знаходзіцца на другім месцы па смяротнасці. Рак шыйкі маткі ў запушчанай стадыі лечыцца вельмі цяжка і мае неспрыяльны прагноз. Чым раней рак прастаты выяўлены, тым больш шанцаў у пацыента быць цалкам вылечаным. Рак малочнай залозы на першым месцы ў жанчын па захваральнасці. Скрынінг па гэтых чатырох лакалізацыях праводзіцца ў краіне з 2011 года, — кажа Віктар Кандратовіч. — Мінск уключаны ў такую работу: спачатку мы ахоплівалі 30 тысяч насельніцтва, пасля — 70, з мінулага года ўзялі чатыры раёны, гэта 527 тысяч насельніцтва. Вынікі падводзіць яшчэ рана. Але мы сутыкнуліся з шэрагам праблем як з боку сістэмы аховы здароўя, так і з боку насельніцтва. Калі ў ахове здароўя мы перабудоўваем сваю работу, і ў Мінску матэрыяльна-рэсурсная база дазваляе вырашыць праблемы, то з боку насельніцтва сутыкнуліся з нізкай свядомасцю. Маючы станоўчыя тэсты па тым жа раку прастаты, колараэктальным раку, мы бачым вельмі нізкую яўку людзей на далейшыя дадатковыя абследаванні. Пры гэтым важна ўсведамляць, што чым раней выяўлены рак і пачата лячэнне, тым больш спрыяльны прагноз.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

8 лютага 2023 г. № 5 (691)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ВЕКТАРЫ РАЗВІЦЦЯ

# АД ГАЛЬШАН ДА САПОЦКІНА

## Як брэндавыя святы працуюць на развіццё тэрыторый і як да гэтага прычыняецца мясцовая ўлада





Фота БелТА

**У Гродзенскай вобласці кожны раён мае сваё адметнае свята. Ды не толькі раён. Многія аграгарадкі і вёскі імкнуцца прыцягнуць да сябе ўвагу цікавымі народнымі абрадамі і традыцыямі, якія ідуць з глыбіні стагоддзяў. Але зрабіць цікавае відовішча — яшчэ паўсправы. Важна яшчэ і ўдала сустрэць гасцей, арганізаваць для іх камфортныя бытавыя ўмовы. Ці стануць брэндавыя святы тым лакаматывам, які павядзе населены пункт да росквіту?**



### ПАДРЫХТОЎКА ДА СВЯТА — ЗА СЕЛЬСАВЕТАМ

Даволі вядомы ў краіне фэст «Гальшанскі замак». Зразумела, што свята непасрэдна звязанае са старажытным гісторыка-культурным комплексам. Але ці апраўдвае сябе гэтае масавае мерапрыемства ў фінансавым плане? Адна справа, калі такі фэстываль ладзіцца ў горадзе ці райцэнтры, дзе можна разлічваць на вялікую масавасць і добры фінансавы збор. Іншая — праводзіць свята ў аграгарадку з абмежаванымі інфраструктурнымі магчымасцямі. Ці можна ў гэтым выпадку казаць аб нейкіх фінансавых перспектывах і развіцці брэндавага фэсту? Бо, уласна кажучы, маштабныя фестывалі і ўрачыстасці павінны не толькі класціся на мясцовы бюджэт, але і спрыяць развіццю асяроддзя, у якім яны праводзяцца.

Гісторыя фэсту ў аграгарадку Гальшаны налічвае 11 гадоў. Мерапрыемства ладзіцца каля сцен замка, звычайна летам. Напрыклад, летась гэта было ў жніўні. Праграма даволі насычаная, галоўнай лакацыяй з'яўляецца інтэрактыўная праграма рыцарскіх клубаў з коннымі турнірамі і вогненным шоу. Сёлета мяркуюць праводзіць фестываль у маі.

Трэба сказаць, фэст стаў яшчэ больш папулярны з адкрыццём паўтара года таму адноўленай паўночнай вежы і музейнай экспазіцыі. Рэканструкцыя былой рэзідэнцыі Паўла Стэфана Сапегі XVII стагоддзя вялася за кошт сродкаў фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва, дзяржпраграмы «Культура Беларусі». За сродкі раённага бюджэту ўстаноўлены візіт-цэнтр з сувенірнай крамай.

Таксама новы выгляд набыла калязамкавая тэрыторыя, з'явіліся вялікая стаянка, сучасныя ліхтары, абсталяваны лесвіца і пляцоўка для агляду.

— У Гальшанах усё падпарадкавана агульнай ідэі — зацікавіць турыстаў. У тым ліку з дапамогай брэндавага фестывалю «Гальшанскі замак». Летась фэст наведала каля дзвюх тысяч чалавек, і гэта пры тым, што мерапрыемства платнае, — адзначае **намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Наталля СТАНКЕВІЧ.**

Відавочна, што папулярнасць фэсту не падае. А ўваходныя білеты дазваляюць зрабіць яго больш відовішчным і неператорным. Сродкі, якія паступаюць ад работы таго ж музея, ідуць на пашырэнне экспазіцыі, закупку новых экспанатаў.

Між тым работы на замку працягваюцца. Рыхтуецца праект па ўмацаванні і кансервацыі сцен паўночна-ўсходняга корпуса. Сёлета на гэтыя мэты дзяржпраграмай выдзяляецца паўмільёна рублёў. Некаторыя праекты распрацаваны самімі работнікамі музея. Напрыклад, з'явілася ідэя ўстанавіць скульптуру каня каля карэты, якая там ужо ёсць. Яна будзе пасаваць да ўязной брамы, што таксама дарабляецца.

Увогуле ў Гальшанах не спыняюцца на адным толькі брэндавым фестывалі. Тут прасоўваюць і свой прадукт «Гальшанскі пернік», які гатуецца па старажытнай рэцэптуры. Нядаўна распрацавана экскурсія па замку з элементамі містыкі, яе будуць праводзіць з прыходам вясны. Усё гэта дазваляе ствараць непаўторны імідж мясцін, адпаведна, расце і турыстычны паток.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Міжпарламенцкія сустрэчы, нарада па інвестыцыях, маніторынг цэн

## Тыдзень у сенатараў быў насычаны

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** і намеснік старшыні гэтай Пастаяннай камісіі Валерый ГАЙДУКЕВІЧ сустрэліся ў Маскве са старшынёй Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па міжнародных справах Грыгорыем Карасіным.

Абмеркаваны ход рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у час сустрэч Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Валянцінай Матвіенкай, падрыхтоўкі мерапрыемстваў маючага адбыцца X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ва Уфе, а таксама пытанні двухбаковага міжпарламенцкага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння ў межах міжпарламенцкіх арганізацый.

У сустрэчы ўзяў удзел першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па міжнародных справах Уладзімір Джабараў.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Гомельаблпрам» Аляксей НЯВЕРАЎ** узяў удзел у апаратнай нарадзе Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

На парадку дня — своечасовая выплата заработнай платы ў арганізацыях вобласці, кантроль сістэмы цэнаўтварэння, рамонт тэхнікі для правядзення веснавых палявых работ, рэалізацыя інвестыцыйных праектаў у Мазырскім раёне ў 2023 годзе, шэраг іншых пытанняў.

«Да кіраўніцтва ўсіх раёнаў вобласці даведзена задача падрабязна раскласці структуру інвестыцыйных укладанняў на працягу года, прычым у сціслыя тэрміны. У кожным рэгіёне важна стварыць новыя перспектыўныя вытворчасці і рабочыя месцы, гэта аснова іх далейшага эканамічнага развіцця, росту дабрабыту мясцовых жыхароў», — адзначыў Аляксей Нявераў падчас нарады.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа» Ала СМАЛЯК** правяла маніторынг цэн у магазінах гандлёвых сетак «Санта» і «Дабраном» і аптэках УП «Фармацыя» ў Гомелі.

Падчас маніторынгу было адзначана: у цэлым, цэны на тавары стабільныя. Дапускаецца рост цэн на некаторыя пазіцыі, разам з тым, у кожным выпадку выяўляюцца прычыны, даецца ацэнка, пры несправядлівым завышэнні прымяняюцца меры, а цэны вяртаюцца на ранейшы ўзровень.

Сенатар звярнула ўвагу, што ў аптэках УП «Фармацыя» ўсталяваліся цэны на медпрэпараты: «Па тых пазіцыях, па якіх вядзецца маніторынг, а гэта лекі першай неабходнасці, цэны не паднімаліся ўжо на працягу доўгага часу. Варта адзначыць асартымент, а таксама прапановы па аналагах розных лекавых сродкаў», — сказала Ала Смаляк.

Парламентарый падкрэсліла, што такі кантроль за цэнамі ідзе на пастаяннай аснове, а любыя спробы завысіць цэны будуць спынены, вінаватыя панясуць адказнасць.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

МЕСЦА ДЗЕЯННЯ

# Не пульс праблем, а імпульс задач

## Дэпутат — не «баец-адзіночка». Ёсць падтрымка ўлады і людзей на месцах



**У гэтым упэўненая старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПАСТУХОВА. Для яе галоўная місія дэпутата базавага ўзроўню — працаваць з людзьмі і дапамагаць у вырашэнні надзённых праблем.**

### Корпус падтрымкі

— Перакананая, што сёння менавіта на пярвічным тэрытарыяльным узроўні вызначаюцца і вырашаюцца найбольш вострыя праблемы. Дэпутацкі корпус мясцовых Саветаў у раёне працуе ў цесным узаемадзеянні з органамі выканаўчай улады і людзьмі на месцах. Такая падтрымка і дазваляе нам, дэпутатам, больш выразна вырашаць сацыяльна значныя пытанні ў жыцці свайго раёна, а галоўнае — вырашаць канкрэтныя праблемы канкрэтных людзей у сельскіх населеных пунктах. Эфектыўнасць дэпутацкай работы, як вядома, вызначаецца ўзроўнем дабрабыту нашых грамадзян і камфортным наладжаным бытам, — падкрэслівае Ірына Мікалаеўна.

Дэпутацкі корпус Лоеўскага раёна — 26 дэпутатаў базавага ўзроўню і 76 сельскіх дэпутатаў. Гэта людзі, якія знаходзяцца ў гушчы праблем і пытанняў мясцовых жыхароў. Найважнейшы орган Лоеўскага райсавета дэпутатаў — прэзідыум, які за мінулы год правёў звыш трох дзясяткаў пасяджэнняў. Сярод разгледжаных на іх пытанняў — стан спажывецкага рынку раёна, арганізацыя харчавання навучэнцаў ва ўстановах адукацыі Лоеўшчыны, развіццё карэкцыйна-адукацыйнага асяроддзя для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

— Адміністрацыйная тэрыторыя нашага раёна падзелена на гарадскі пасёлак і сем сельсаветаў, — тлумачыць Ірына Пастухова. — Я як старшыня дэпутацкага корпуса і калегі-дэпутаты райсавета бяром удзел у выязных асабістых прыёмах грамадзян, якія праводзяцца на тэрыторыях сельсаветаў.

### Не кабінетны стыль

За мінулы год дэпутатамі Лоеўскага райсавета дэпутатаў было арганізавана 216 асабістых прыёмаў. Пры садзейнічанні дэпутацкага корпуса дадаткова разгледжана каля 50 пытанняў.

— Прыём у рабочым кабінеце менш актыўны, чым сустрэчы па месцы жыхарства і ў выбарчых акругах. Такая форма работы зарэкамендавала сябе са станоўчага боку. І дэпутаты, якія атрымалі падтрымку выбаршчыкаў, бяруць непасрэдны ўдзел у разглядзе і вырашэнні хвалюючых людзей пытанняў. Прыёмы грамадзян даюць магчымасць больш шырока бачыць праблемы мясцовага значэння або канкрэтнага выбаршчыка, — лічыць старшыня райсавета дэпутатаў.

Летась у Лоеўскім раёне дэпутацкі корпус актыўна заявіў аб сабе падчас правядзення дыялогавых пляцовак з удзелам працоўных калектываў. У дадзеным фармаце абмяркоўваліся як актуальныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, рэгіёна і краіны ў цэлым, так і агульнарэспубліканскія праекты — абнаўленне Асноўнага Закона краіны, Усебеларускі народны сход, унясенне змяненняў у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь.

— Каб павысіць адказнасць мясцовых дэпутатаў перад выбаршчыкамі, у раёне выкарыстоўваецца такая форма работы з насельніцтвам, як Дні дэпутата, — дзеліцца суразмоўніца. — Падчас іх правядзення дэпутаты не толькі сустракаюцца з жыхарамі сельскіх населеных пунктаў, але і бяруць актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні вёсак. Робім збор проб вады, дапамагаем з ачысткай і рамонтам шахавых калодзежаў, сумесна з людзьмі арганізоўваем суботнікі па навядзенні парадку, прымаем меры для выдалення небяспечных дрэў. Я ў гэтым бачу рашэнне адной з агульнараённых задач — зняць праблемнае пытанне пры яго першым агучванні і не дапускаць росту скаргаў і зваротаў у іншыя інстанцыі. У бягучым годзе на тэрыторыі Лоеўскага раёна арганізавана і праведзена шэсць Дзён дэпутата на тэрыторыі сельсаветаў. Пры правядзенні гэтых мерапрыемстваў дэпутаты сустракаліся з працоўнымі калектывамі, праводзілі асабістыя прыёмы, знаёміліся з дзейнасцю ўстаноў, якія функцыянуюць на тэрыторыі сельсаветаў, праводзілі маніторынг тавараў і цэн у гандлёвых аб'ектах і аптэках, — падкрэслівае лідар дэпутацкага корпуса раёна.

Дарэчы, у правядзенні Дзён дэпутата, правядзенні асабістых прыёмаў грамадзян на тэрыторыі раёна актыўна ўдзельнічаюць дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Хойніцкай выбарчай акрузе Жанна Чарняўская і член Савета Рэспублікі ад Гомельскай вобласці Ала Смаляк.

### Пульс праблем і імпульс задач

— У рабоце з людзьмі на месцах варта адзначыць і ролю Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню. У кампетэнцыю менавіта гэтага звяна ўваходзіць вырашэнне шэрагу пытанняў, якія маюць штодзённы характар і хвалююць вясковых жыхароў, — адзначае Ірына Пастухова. — Як прыклад канструктыўнага ўзаемадзеяння дэпутатаў пярвічнага ўзроўню з насельніцтвам, актыўны ўдзел жыхароў у фінансаванні добраўпарадкавання тэрыторый сваіх населеных пунктаў.

За мінулы год за кошт ахвяраванняў ад насельніцтва было сабрана звыш васьмі тысяч рублёў. Усе сродкі пайшлі на фінансаванне тых праектаў, якія вызначылі самі жыхары на сходах грамадзян. Як правіла, гэта добраўпарадкаванне сельскіх населеных пунктаў, набыццё і ўстаноўка агароджаў на сельскіх могілках, выдаленне аварыйных дрэў.

— Між тым сума сродкаў самаабкладання па выніках мінулага года склала 110 рублёў. Гэта сведчыць, што ў згаданым напрамку дапушчаны пэўныя недапрацоўкі, — кажа лідар дэпутацкага корпуса раёна. — Прычына і ў невялікай актыўнасці саміх народных выбраннікаў, і ў няправільнай пастаноўцы пытання кіраўнікамі на месцах, і, магчыма, у недастатковым інфармаванні нашых людзей. Таму дадзенае пытанне застаецца на пастаянным кантролі і патрабуе ў бягучым годзе выпрацоўкі новых формаў і метадаў работы.

Дэпутат — не «баец-адзіночка», перадае прынцып у рабоце калег у раёне Ірына Пастухова:

— Многія задачы ўдаецца вырашыць толькі дзякуючы сумеснай рабоце з мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый. Таму многае і ўдаецца.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў.**

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# ТРЫ СУДЫ ЗА ХАТУ БЕЗ ДАХУ

## Як мясцовая ўлада спраўляецца з праблемамі пры адчужэнні і продажы пустых дамоў

**ПАСЛЯ ўступлення ў сілу 27 верасня 2021 года Указа № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі» купіць дамок у вёсцы сапраўды становіцца працей нават таму, хто не мае вялікіх грошай. Трэба толькі не ленавацца сачыць за інфармацыяй на сайтах, цікавіцца ў выканкамах, і мара пра сваю сядзібку ў вёсцы можа стаць рэальнасцю.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Гэта калі трэба купіць. А вось калі стаіць задача процілеглая — прадаць, як з гэтым? Якія праблемы даводзіцца вырашаць, якія падводныя камяні сустракаюцца, карэспандэнт газеты пацікавілася ў Тэвельскім сельскім Савеце Кобрынскага раёна. Гэты сельсавет не назавеш аддаленым, ад Брэста да Тэўляў нейкія семдзясят кіламетраў. Але ёсць свая спецыфіка названай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі: у склад яе ўваходзіць 21 населены пункт. Шэраг вёсак можна аднесці да катэгорыі так званых паміраючых, дзе засталося пражываць адзін-два-тры чалавекі. Асабліва хутка згасае жыццё ў той частцы сельсавета, што мяжуе ажно з трыма раёнамі: Пружанскім, Жабінкаўскім, Камянецкім. Населеныя пункты тут дажываюць свой век.

Скажам, у вёсцы Навасёлкі, якая размешчана ў глухім закутку, наводдаль ад дарог, пастаянна пражывае толькі адна бабуля. Пустыя хаты гадамі стаяць недагледжаныя, зарастаюць хмызняком, спадчыннікі імі не надта цікавяцца. Сёлета ў дачыненні да некалькіх дамоў з названай вёскі сельвыканкам пачынае працэдуру прызнання іх безгаспадарчымі. Але пра гэта крышку пазней.

Летась на тэрыторыі сельсавета знеслі дзевяць дамоў, зямлю ўвялі ў севазварот. На гэты год планы яшчэ большыя. Старшыня Тэвельскага сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА сказала, што працаваць у гэтым кірунку па Указе № 116 стала прасцей, чым раней, але ж праблем і цяжкасцяў хапае. І звязаны яны найперш са стаўленнем спадчыннікаў да сваёй нерухомасці. Здараецца, што яны нічога не робяць на бацькоўскай сядзібе, але і расстацца з ёй не спяшаюцца. Як вядома, прызнаць дом безгаспадарчым па-ранейшаму можа толькі суд.

На першым этапе сельвыканкам збірае звесткі пра хату, якая стаіць больш за тры гады без выкарыстання, агляд праводзіць спецыяльна скліканая камісія. Далей у работу ўключаюцца адпаведныя службы райвыканкама. Вядзецца пошук патэнцыяльных спадчыннікаў. Іх інфармуюць аб магчымым прызнанні пабудовы безгаспадарчай. На гэтым этапе яны могуць заявіць правы і, што важна, узяць на сябе абавязацельствы па прывядзенні ў парадак сядзіб ці пабудоў. Калі ахвотных узяцца за работу ў вызначаны тэрмін не знаходзіцца, дакументы накіроўваюцца ў суд, які прымае рашэнне.

— Працэдура даволі складаная і працяглая, — расказвае Іна Кузняцова. — Па адным з такіх дамоў, трухлявым і напаўразбураным, судовыя пасяджэнні праводзіліся аж тры разы. На першым судзе свае правы заявіў спадчыннік і сказаў, што сам правядзе работы па зносе, бо дом быў у такім стане, які не дазваляў аднаўленне. Яму вызначылі фронт работы і тэрмін. Але да другога судовага пасяджэння гаспадар толькі знёс дах, рашэнне зноў адклалі. На трэці раз прэтэндэнт на нерухомасць наогул не з'явіўся ў суд. А калі яму патэлефанавалі, сказаў, што работы аказалася надта многа, патрабуюцца сродкі, а ён не разлічваў на гэта, таму не супраць, каб пабудовай займалася мясцовая ўлада. Такім чынам, толькі на трэці раз суд сваім рашэннем перадаў напаўразваленую хату сельвыканкаму, які і правёў работы па зносе. На ўсе суды даявлялася ездзіць кіраўніку мясцовай улады, прысутнічаць спецыялістам райвыканкама. А гэта час, які можна было б патраціць на іншыя важныя справы, у тым ліку на навядзенне парадку з праблемнай нерухомасцю.

— Зносіць стараемся зусім нехлямяжыя дамы, — працягвае Іна Валер'еўна. — А тыя, якія можна выкарыстоўваць, імкнёмся прадаваць. Некалькі гадоў таму прадалі нядрэнную хату ў Завершы. — Зараз і паглядзець прыемна. Новыя гаспадары ачысцілі двор ад хмызняку, паставілі агароджу. Пастаянна яны не жывуць, але паспяхова выкарыстоўваюць дом у якасці дачы.

Вось і ў гэтым годзе Тэвельскі сельскі Савет выставіў на продаж чатыры хаты, якія раней былі перададзены ва ўласнасць як нічыйныя. Пасля ацэнкі Брэсцкім агенцтвам па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры быў вызначаны рынкавы кошт кожнай з пабудоў, аб'явы аб продажы размешчаны на сайце райвыканкама, у раённай газеце. Варта заўважыць, што з 1 студзеня звесткі яшчэ размяшчаюцца ў Адзіным рэестры пустых дамоў на базе дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы «Адзіны рэестр маёмасці» (доступ да яго адкрыты). Дык вось на два дамы — у Тэўлях і Рынках — ахвотныя хутка знайшліся. Грамадзяне падалі заявы, якія будуць разгледжаны на пасяджэнні выканкама з прыняццем адпаведнага рашэння. Пасля гэтага ў кожным выпадку будзе заключаны дагавор аб куплі-продажы, выстаўлены рахункі з улікам затрат па ацэнцы (гэта прыкладна 400 рублёў). Пасля аплаты пакупнік зможа распачаць афармленне дакументаў на ўласнасць дома і ўчастка.

Калі ж на працягу 30 дзён пакупнікоў не знайшлося, то першапачатковы кошт паніжаецца на 80 працэнтаў. 30 дзён ужо прайшло, значыць, такі парадак будзе прыменены да двух з чатырох дамоў, што выстаўлены на продаж, — у Завершы і Дзявятках.

Паводле назірання старшыні выканкама, некаторых патэнцыяльных пакупнікоў, дарэчы, цікавіць не столькі дом, колькі ўчастак зямлі пры ім. Ёсць такія, дзе маецца 50 і нават 70 сотак. Сядзібы з вялікімі надзеламі купляюць людзі, якія зацікаўлены ў вядзенні ўласнай падсобнай гаспадаркі. На такога пакупніка разлічвае мясцовая ўлада ў Навасёлках, пра якія гаварылася вышэй. Адну хату там набыў некалькі гадоў таму чалавек, які вырошчвае клубніцы. І, паводле яго слоў, не супраць пашырыць свае плантацыі. Магчыма, ён захоча купіць яшчэ пабудовы, знесці іх, рэкультываваць зямлю і апрацоўваць яе. Усё лепш, чым панурая карціна былой вёскі на ўзлеску, што зарастае бур'яном ды дробным хмызняком, які падыходзіць у некаторых месцах да самых вокнаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Кобрынскі раён.*

# АД ГАЛЬШАН ДА САПОЦКІНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Хоць тэрыторыя Гальшанскага замка і сам аб'ект летась перададзены на баланс упраўлення культуры Ашмянскага райвыканкама, мясцовы сельвыканкам не застаецца ўбаку ад арганізацыі брэндавага фэсту. Добраўпарадкаванне тэрыторыі, падрыхтоўка да свята кладзецца на сельскі Савет. З іх боку вядуцца рамонтныя работы, абкошванне травы, добраўпарадкаванне. Турызм станоўча ўплывае на мясцовы бюджэт, які папаўняецца праз гандлёвыя пункты, аб'екты грамадскага харчавання, гасцініцы, выязны гандаль.

— У Гальшанах працуе тры кафэ, і яны за некалькі дзён да пачатку фестывалю пастаянна поўныя. Тое ж можна сказаць і пра дзве прыватныя гасцініцы, праўда, яны невялікія, разлічаны на дзясятак месцаў. Іх браніруюць ажно за некалькі тыдняў да фестывалю, — расказаў **в. а. старшыні Гальшанскага сельвыканкама Аляксандр САВАНЕЦ.**

Прадстаўнік мясцовай улады паведаміў, што для тых, хто жадаў бы адкрыць тут гасцініцу ці наогул вялікі турыстычны комплекс, такая магчымасць можа з'явіцца. Сёлета на аўкцыён выстаўляецца даволі значны комплекс будынкаў старой бальніцы ў Гальшанах. Цяпер вядзецца ацэнка маёмасці.

## ПЕРАД ФЭСТАМ — КОНКУРС НА НАЙЛЕПШЫ ПАДВОРАК

У гарадскім пасёлку Сапоцкін, які знаходзіцца за 200 кіламетраў ад Гальшан, таксама ёсць сваё брэндавае свята, хоць і не такое маштабнае, але па-свойму унікальнае. Сёлета вось ужо восьмы раз тут правядуць Свята пісанкі. Трэба сказаць, што такога фэсту няма больш нідзе. Толькі тут захавалася старадаўняя тэхналогія афарбоўкі пасхальных яек — пісанак. Яны традыцыйна чорнага колеру з нанясеннем васковага ўзору. Пісанкі ўнесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі як элемент нематэрыяльнай спадчыны. Некалькі гадоў таму ў пасёлку адкрылі тэматычны музей, дзе прадстаўлена паўтары тысячы яек — сапраўдных твораў мастацтва. Тут можна не толькі пазнаёміцца з унікальнай тэхнікай аздаблення пасхальных яек, але і атрымаць майстар-клас па іх роспісе.

На думку **старшыні Сапоцкінскага сельвыканкама Андрэя САДКОЎСКАГА,** такія святы спрыяюць падтрымцы традыцый, а яны — той фактар, які цікавіць турыстаў.

— Гэта абласное свята, у якім бяруць удзел творчыя калектывы і майстры не толькі раёна, але і вобласці. Яны дэманструюць свае здабыткі, гэта цікава для наведвальнікаў. Задача мясцовай улады — добра падрыхтавацца да сустрэчы гасцей, — падкрэсліў у гутарцы старшыня сельвыканкама. — У сувязі з тым перад пачаткам свята ідзе агляд тэрыторыі, населены пункт абнаўляецца, наводзіцца парадак у дварах. Мы нават праводзім конкурс на найлепшы падворак, што з'яўляецца добрым стымулам для гаспадароў сядзіб.

Ёсць у гарадскім пасёлку і вялікі святлодыёдны экран, на якім трансліруецца свята — як у рэжыме рэальнага часу, так і ў запісе на працягу года. Турысты, якія едуць праз Сапоцкін на Аўгустоўскі канал, бачаць з дарогі гэты экран і могуць зацікавіцца мерапрыемствам.

Па словах Андрэя Садкоўскага, інфраструктура пасёлка паляпшаецца. На тэрыторыі сельскага Савета каля дзясятка аграсядзіб, якія размешчаны вакол Аўгустоўскага канала. Завяршаецца маштабная рэканструкцыя палацава-паркавага комплексу ў Святцку пад турыстычны цэнтр з гасцініцай. Некалькі гадоў таму ў рамках міжнародных праектаў адрамантаваны амаль усе праблемныя ўчасткі дарогі, якая вядзе на Аўгустоўскі канал і на Сапоцкін.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



Фота БелТА.

**Кампетэнтна**

**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Штогод на Гродзеншчыне праводзяцца брэндавыя мерапрыемствы, і колькасць іх пастаянна расце. Ва ўсіх на слыху фестываль нацыянальных культур, аўтамабільны фестываль, якія традыцыйна праходзяць у Гродне раз на два гады. Летась упершыню праведзены каравай-фэст «Бацькава булка» ў Свіслачы, з году ў год набываюць усё большую папулярнасць «Іўеўскі памідор», «СынкаВеча» на Зэльвеншчыне, фестываль кветак у Жалудку. Сёлета вяртаецца LIDBEER — унікальны інтэрактыўны опэн-эйр, які на адзін дзень пераўтварае гістарычны цэнтр сталіцы беларускага броварства Ліды ў маштабную фестывальную пляцоўку. На гэтыя святы традыцыйна прыязджаюць госці з усёй краіны і замежжа. Такі падыход садзейнічае захаванню народных традыцый і папулярызацыі турыстычнага патэнцыялу.

Многія традыцыі аднаўленыя. Такая ж работа вядзецца і ў адносінах да інфраструктуры. У працэс актыўна ўключаюцца мясцовыя жыхары. Такім чынам уносіцца пэўны каларыт у развіццё тых месцаў, дзе ладзяцца традыцыйныя святы. Фэсты, у сваю чаргу, актывізуюць работу інфраструктурных аб'ектаў, якія праз падаткі папаўняюць мясцовы бюджэт.

# КАЛЯНДАР УРАЖАННЯЎ

**За апошнія гады турыстычная галіна прырасла новымі маршрутамі і падзеямі, беларусы сталі больш актыўна падарожнічаць па рэгіёнах, павялічылася колькасць гасцей з Расійскай Федэрацыі. Замежныя турысты едуць ужо не толькі ў санаторыі і аграсядзібы. Часта пры выбары месца адпачынку яны пралічваюць і магчымасць атрымаць цікавы вопыт і ўражанні. На працягу ўсяго года ў Беларусі ладзяцца разнастайныя фестывалі, святы, абрады, тэматычныя мерапрыемствы. Так, Міністэрствам культуры сумесна з рэгіёнамі падрыхтаваны Каляндар культурных мерапрыемстваў на 2023 год, які дапаможа айчынным і замежным турыстам сарыентавацца, куды варта прыехаць у найбліжэйшыя выхадныя ці святочныя дні альбо ў час канікулаў і водпускаў. Як паведаміў начальнік упраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Раман МАМЧАНКА, у календары змешчана інфармацыя аб 120 брэндавых мерапрыемстваў. Гэта выдатная магчымасць азнаёміцца з культурнымі здабыткамі рэгіёнаў, даведацца больш пра гісторыю пэўных гарадоў, мястэчак і вёсак. І кожнае такое адкрыццё прыносіць з сабой шмат пазітыўных эмоцый.**

Арганізатары прапануюць мерапрыемствы, розныя па тэматыцы і маштабе. Некаторыя з іх даюць магчымасць паназіраць за аўтэнтычнымі абрадамі, якія ўнесены ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, у маі ў вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна ладзіцца «Юраўскі карагод», а ў Веткаўскім раёне праходзіць абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы».

Гасцей будуць чакаць і на Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў г. п. Акцябрскі. Тут пройдуць конкурс танцавальных пар, турнір дзіцячых калектываў, выступленні фальклорных ансамбляў і выканаўцаў, кірмаш з удзелам рамеснікаў.



Фота БелТА.

**Гасцей будуць чакаць і на Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў г. п. Акцябрскі.**

Рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі» пройдзе 8 ліпеня ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка». Гэтае свята, прымеркаванае да дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, ладзіцца з 1972 года.

Дарэчы, менавіта мерапрыемствы да Купалля збіраюць найбольшую колькасць гасцей. Свята адзначаецца ў розных кутках Беларусі, але найбольш маштабна яго сустракаюць на Шклоўшчыне. На традыцыйнае мерапрыемства «Александрыя збірае сяброў» прыязджае ад 50 да 100 тысяч гледачоў.

Вельмі шырока ў краіне праводзяцца гістарычныя рэканструкцыі, прысвечаныя розным падзеям. На Барысаўшчыне, напрыклад, ладзіцца фестываль «Бярэзіна», дзе дзякуючы ваенна-гістарычным клубам і аб'яднанням, якія спецыялізуюцца на рэканструкцыі касцюмаў, зброі ды даспехаў XIX стагоддзя, можна паназіраць за «боем» рускай і французскай армій, пераправай войскаў Напалеона праз Бярэзіну.

У атмасферу сярэднявечча можна паглыбіцца і ў Нясвіжы: у жніўні тут пройдзе фестываль гістарычнай рэканструкцыі, выступяць калектывы, якія выконваюць музыку XVI—XVIII стагоддзяў. У чэрвені можна трапіць на «Любчанскі шпацыр Радзівілаў» у Любчанскім замку. А Лідскі замак у маі здзівіць фестывалем «Магія агню і святла».

У нашай краіне вялікая ўвага аддаецца захаванню народных промыслаў і рамёстваў. Пазнаёміцца з майстрамі і падзівіцца на рэчы, якія яны ствараюць, можна на разнастайных фестывалях, што праходзяць як на рэгіянальным, так і на рэспубліканскім узроўні. Больш за дваццаць гадоў у Гродна з'язджаюцца рамеснікі Беларусі і замежжа на свята «Казюкі». Традыцыйным стаў рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Вясновы букет», сёлета ён пройдзе ў маі ў Верхнім горадзе ў Мінску.

Сёлета Слуцк абраны культурнай сталіцай Беларусі, і адным з самых яскравых мерапрыемстваў абяцае стаць свята мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы», якое запланавана на верасень. У ім возьме ўдзел каля 500 майстроў, якія працуюць па дваццаці кірунках народнай творчасці. У гэты ж час пройдзе міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная пытанням захавання майстэрства ткацтва паясоў, і свята-конкурс «Беларуская лялька».

Магілёўшчына рыхтуецца да фестывалю народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі», які пройдзе 18 жніўня.

Больш даведацца пра бортніцтва можна ў Лельчыцкім раёне. Такі промысел узяты пад ахову і ўнесены ў Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. 21 мая ў аграгарадку Сімонічы пройдзе свята «Мядовы фальварак».

Варта згадаць і «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім, «Мотальскія прысмакі» на Іванаўшчыне, каравай-фэст «Бацькава булка» ў горадзе Свіслач...

Кожны рэгіён стараецца падабраць для фестываляў адметную тэму. Так, Кіраўшчына запрашае на «Сенафэст» у вёску Чыгірынка са спаборніцтвамі касцоў, конкурсамі па пляценні вянкоў, вырабе фігур з сена і касцюмаў з прыроднага матэрыялу.

У аграгарадку Парэчча пад Гроднам з'явіўся першы на тэрыторыі Беларусі вакзал. Менавіта праз станцыю Парэчча прайшла чыгуначная дарога Санкт-Пецярбург — Варшава. Таму тут 30 ліпеня ладзіцца Свята вакзала з тэатралізаваным прадстаўленнем, дзякуючы якому госці пераносяцца ў далёкі 1862 год — час, калі адкрываўся найстарэйшы на нашых землях пункт прыпынку цягнікоў.

Не забыліся арганізатары і пра аматараў музыкі. У календары падзей — «Балетнае лета ў Вялікім» у сталіцы, міжнародны фестываль духоўнай музыкі ў Магілёве, шоу ў стылі Сан-Рэма на тэрыторыі замкавага комплексу «Мір», «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў», міжнародны конкурс джазавай і эстраднай музыкі ў Салігорску, міжнародны фестываль старадаўняй і сучаснай камернай музыкі ў Полацку, фестываль «Вялікая бард-рыбалка» на Быхаўшчыне, конкурс бардаўскай песні памяці Уладзіміра Высоцкага «Музыка сэрцаў» на возеры Літоўка пад Навагрудкам.

У мясцінах, дзе праходзяць буйныя фестывалі, варта выдзеліць час на знаёмства з рэгіёнам. Напрыклад, пад кожны горад, у якім праходзіць Дзень пісьменства, распрацоўваюцца адмысловыя экскурсіі, на якія можна трапіць і падчас свята, і калі яно ўжо скончыцца.

Азнаёміцца з календаром адметных падзей можна на сайтах Міністэрства культуры і Нацыянальнага агенцтва па турызме.

**Ганна ПЯТРОВА.**

СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

# Аўтэнтычны народны строй і фруктовыя кансервы

